Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

ГОД ВЫДАННЯ XXIV

№ 31 6913)

ПЯТНІЦА 7 ЛЮТАГА 1941 г.

ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Сустрэнем XVIII Усесаюзную партыйную канферэнцыю новымі вытворчымі перамогамі.

V з'езд КП(б) Літвы.

IV з'езд комуністычнай партыі (большэвікоў) Эстоніі.

Пленум Баранавіцкага абкома КП(б)Б.

Сход партыйнага актыва гор. Гомеля.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ: **М. Паўлючэнкаў** — Палепшыць партыйнае кіраўніцтва школамі ФЗА. **Я. Качан** — У Несвіжы не кіруюць прапагандай.

Усямерна развіваць выраб тавараў шырокага спажывання і прадуктаў харчавання. Д. Рубіновіч — Нашы планы. **І. Пучынскі** — Нескарыстаныя магчымасці. **І. Салавей** — Расшыраем асартымент.

АРТЫКУЛЫ: **В. Рубанаў** — Торфавіўняніты — каштоўнае ўтнаенне. **В. Пічэта** — Вынікі першай усебеларускай канферэнцыі гісторыкаў. **Т. Зомаў** — Вялікія рэзалюцыі і карлікавыя фермы. **А. Джэлюк** — Арганізацыя масавай агразоатэхвучобы. **Тар. Хадкевіч** — Ленінскія агні.

БІБЛІЯГРАФІЯ. **І. Азоўскі** — Дакументы па гісторыі прамадзянскай вайны ў СССР.

ЗА РУБЯЖОМ: **Вайна ў Еўропе і Афрыцы** (дзённік ваенных дзеянняў, 6 лютага 1941 г.). Паветраны бой над Ла-Маншам. Пасяджэнне венгерскага парламента. Заява прадстаўніка бельгійскага пасольства ў ЗША. Да становішча ў Румыніі.

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ РЫХТАВАЦЦА ДА ТОРФСЕЗОНА

Бесперабойная работа прамысловасці, электрастанцый, нармальнае забеспячэнне палівам жылых дамоў, устаноў за многім залежыць ад таго, як тарфяная прамысловасць спраўляецца з дзяржаўным заданнем — здабычай торфу.

У Беларускай ССР з мясцовых відаў паліва галоўнае месца займае торф. Яго ўдзельная вага ў паліўным балансе рэспублікі складае 98,7 проц.

Тарфяная прамысловасць за гады сталінскіх пяцігодак вырасла ў адну з вядучых галін народнай гаспадаркі рэспублікі. Тарфяныя заводы аснашчоны перадавой тэхнікай. Дастаткова сказаць, што толькі за другую пяцігодку ўкладанні ў развіццё тарфяной прамысловасці рэспублікі складалі 67 мільёнаў рублёў, а да канца трэцяй пяцігодкі яны дасягнуць 200 мільёнаў рублёў.

Торфазаводы забяспечаны фрэзернымі, багернымі, скрэпернымі машынамі, гідраўлічнымі насосамі. Ёсць дастаткова трактараў, мотавозаў. Выраслі выдатныя кадры тарфянікаў, паказваючыя ўзоры большэвіцкіх адносін да працы. На асноўных торфазаводах для рабочых пабудаваны добрыя інтэрнаты, клубы, сталовыя.

Партыя і ўрад стварылі ўсе ўмовы для паспяховай работы тарфяной прамысловасці. Аднак здабыча торфу яшчэ астаецца на нізкім узроўні, не задавальняе растучыя патрабаванні народнай гаспадаркі. У мінулым годзе на палях торфазаводаў «Асінторф», «Чырвоны сцяг», «Свабода», «Дукоры» і інш. засталося многа торфу. Адгружана многа нетаварнага торфу. Усё гэта зараз адбіваецца на нармальнай рабоце электрастанцый, прадпрыемстваў.

З-за нясвоечасовай падрыхтаванасці да торфсезона, неахайных, безадказных адносін асобных кіраўнікоў многія машыны ў разгар сезона днямі, тыднямі прастайвалі без ўсякага руху. Дробныя рамонты, якія павінны былі эпізнчана на-ходу, пралаўжаліся 5—6 гадзін. Аварыі, паломкі машын былі частым з'явішчам на заводах («Радзічава» і інш.).

Каб унікнуць мінулагодніх памылак, трэба ўзмацніць тэмпы падрыхтоўкі да торфсезона, сустрэць яго ва ўсеўзбраенні. Першае і асноўнае, што трэба зрабіць,— **гэта поўнасцю, добраякасна і ў тэрмін адрамантаваць механізмы, прывесці іх у баявую гатоўнасць.**

Між тым на прадпрыемствах Галоўторфа план рамонту выканан толькі на 65 проц. Па некаторых-жа заводах — і таго менш. Напрыклад, на торфазаводзе «Радзічава» (дырэктар тав. Дворкін, галоўны інжынер тав. Дзенджык) план рамонту механізмаў выканан на 20 проц. Апрача таго якасць праведзенага рамонту вельмі нізкая. На торфазаводзе «Свабода» (дырэктар тав. Егораў, галоўны інжынер тав. Пятроў) неабходна пераабсталяваць тры элеватарныя машыны ў гідраэлеватарныя, але ні адна з іх не гатова. Толькі неарганізаванасцю, стаўкай на самацёк можна аб'ясніць такія недапушчальныя і антыдзяржаўныя адносіны да рамонту механізмаў.

Відаць, дырэктары і галоўныя інжынеры гэтых заводаў не ўсведамляюць усёй той адказнасці, якая ўскладзена на іх партыяй і ўрадам. Незразумела, чаму церпяць такое становішча кіраўнікі Наркамата мясцовай паліўнай прамысловасці і Галоўторфа.

Асаблівая ўвага павінна быць звернута на падрыхтоўку палёў сушкі. У першую чаргу яны павінны быць аслабанёны ў самыя спісныя тэрміны ад мінулагодняга торфу. Трэба зрабіць усё неабходнае для таго, каб утрымаць у добрым стане каналы. З першых-жа вясенніх дзён правесці рамонт асушальнай сістэмы, зрабіць паліроўку, карчоўку і т. д.

Не менш важным пытаннем з'яўляецца своечасовае заключэнне дагавораў на сезонную рабочую сілу. Па плану неабходна набраць 9.770 рабочых. На 1 лютага заключана дагавораў толькі на 4.525 чалавек. Вельмі марудна ідзе вярбоўка па Палескай, Баранавіцкай абласцях. Адстае Асінторф. Яму неабходна набраць 4 з палавінай тысячы рабочых, а набрана не больш 600.

Тэрмін заключэння дагавораў канчаецца 1 сакавіка. Астаецца зусім мала часу. Трэба прыняць усе меры к таму, каб поўнасцю забяспечыць торфзаводы рабочай сілай.

Але набраць рабочых — гэта палавіна справы. Трэба зрабіць усё неабходнае для найлепшага культурнага і бытавога абслугоўвання тарфянікаў.

У мінулым годзе на торфазаводзе «Чырвоны сцяг» з-за дрэнных бытавых умоў многія рабочыя пакінулі работу. Дырэктар гэтага завода тав. Рыбінскі і зараз нічога не робіць, каб упарадкаваць інтэрнаты; добрыя памяшканні з-за неацэнлення іх прыходзяць у негоднасць: абвальваецца штукатурка; ва ўсіх пакоях брудна, павыбіты шыбы. Аналагічныя факты, на жаль, маюць месца і на торфазаводзе «Свабода».

Прывесці ў добры стан інтэрнаты, сталовыя, чырвоныя куткі, паклапаціцца аб своечасовым забеспячэнні рабочых прадуктамі харчавання — абавязак кожнага гаспадарніка-большэвіка.

Партыйныя арганізацыі торфараспрацовак яшчэ слаба ажыццяўляюць кантроль дзейнасці адміністрацыі. Маюць месца прымірэнцкія адносіны да недахопаў у рабоце прадпрыемстваў. Такое становішча далей нецярпіма. Ведаць работу кожнага ўчастка, агрэгата, змагацца за высокую прадукцыйнасць працы і ўзорную дысцыпліну, сістэматычна весці палітыка-выхаваўчую работу сярод тарфянікаў, дабівацца, каб у кожным інтэрнаце, чырвоным кутку былі радыё, газета — найпершы абавязак партыйных, а таксама прафсаюзных арганізацый торфапрадпрыемстваў.

Барацьба за мясцовае паліва — не ведамственая справа. За поўнае выкананне плана торфаздабычы, за стан паліткамасавай работы на торфазаводах поўную адказнасць нясуць і райкомы партыі, выканкомы советаў тых раёнаў, на тэрыторыі якіх размешчаны прадпрыемствы. Іх задача — кантраляваць работу, дапамагаць заводскім арганізацыям, каб агульнымі намаганнямі каваць перамогу, выкананць дзяржаўнае задание.

З кожным годам усё больш узрастае значэнне торфу ў народнай гаспадарцы. Навука адкрывае ўсё новыя і новыя перспектывы і магчымасці скарыстання торфу. Перад ім — сапраўды вялікая будучыня.

Торф патрэбен краіне не толькі як паліва. Ён скарыстоўваецца і ў сельскай гаспадарцы для ўтнаення, для падсілу жывёле. Брыкеты з торфу могуць замяніць дровы і бензін.

У Беларусі распрацаван метад атрымання з торфу этылавага спірту. Практычнае трымянне яго дасць магчымасць захаваць тысячы тон бульбы і зярна. Велізарнае народна-гаспадарчае значэнне маюць работы Інстытута хіміі Акадэміі навук БССР па пытаннях тэрмахімічнай перапрацоўкі торфу — атрымання з яго кокса, газа, тарфяной смалы, а з яе ў сваю чаргу раду такіх каштоўных прадуктаў, як вадкае паліва, крэазол, парафін, воск, аміяк.

Вось чаму да работы тарфяной прамысловасці павінна быць прыкавана ўвага ўсёй нашай грамадскасці.

Здабыча торфу — справа сезонная. Да яе трэба рыхтавацца зараз-жа, з усёй дакладнасцю, не ўпускаючы з віду ні адной дробязі. Баявая задача ўсіх камандзіраў вытворчасці, партыйных і прафсаюзных арганізацый торфазаводаў, апіраючыся на вопыт і дасягненні перадавікоў, — дабіцца выканання і перавыкананння гадавога плана здабычы і сушкі торфу.

Сустрэнем XVIII Усесаюзную партыйную канферэнцыю новымі вытворчымі перамогамі!

Калектыў абутковай фабрыкі імені Кагановіча выканаў сваё абавязацельства

Уступіўшы ў соцыялістычнае спаборніцтва імені XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі, калектыў мінскай абутковай фабрыкі імені Кагановіча ўзяў на сябе абавязацельства за кошт эканоміі матэрыялаў выпусціць да 15 лютага 20.000 пар абутку звыш плана, павялічыць выпуск першасортнага абутку на адзін процант супроць задання і т. д.

Сваё абавязацельства калектыў з чэсцю выканаў. На 5 лютага выпушчана 22.013 пар абутку звыш плана.

Многія стаханаўцы дабіліся высокіх вытворчых паказальнікаў і значна перавыконваюць узятыя на сябе абавязацельствы. Так, знатны стаханавец першага папыўвачнага цэха тав. З. Скабло ў снежні выконваў норму на заціяжцы наскоў (адзін з асноўных працэсаў на папыўвачным канвееры) на 180 проц., а зараз дае 209—210 проц. Работніца швейнага цэха тав. Праліч, фрэзероўшчык тав. Мурох павялічылі выпрацоўку з 135 да 168 процантаў.

Па ініцыятыве партыйнай арганізацыі зараз на фабрыцы шырока разгарнулася барацьба за ўнядрэнне культуры на вытворчасці, навядзенне належнага парадку ў цэхах і на рабочых месцах, за чыстату машын і іншага абсталявання.

У цэхах ужо прыступлена да практычнага ажыццяўлення рашэнняў адбыўшайся нядаўна партыйна-тэхнічнай канферэнцыі. У закройным цэху, напрыклад, праводзіцца перапляц трафарэтаў па раскрою тэкстыльнай падкладкі, у вопытным парадку робіцца сквазны разруб скур.

У першым папыўвачным цэху ўведзена некалькі дадатковых аперацый па паляпшэнню аддзелкі абутку.

М. ПАКРОЎСКІ.

Узорная работа чыгуначнікаў Мінскага аддзялення

У барацьбе за выкананне ўзятых на сябе абавязацельстваў у соцыялістычным спаборніцтве імені XVIII партканферэнцыі калектыў Мінскага чыгуначнага аддзялення паказвае выдатныя ўзоры работы. Рабочыя Мінскага вагоннага дэпо ў студзені датэрмінова выканалі месячнае задание па рамонту таварных і пасажырскіх вагонаў. 30 студзеня вагоннае дэпо выпусціла з рамонту 36 таварных вагонаў. Выканана месячнае задание і па рамонту пасажырскіх вагонаў. Звыш плана адрамантаван адзін пасажырскі вагон.

У хоцве соцыялістычнага спаборніцтва ў вагонным дэпо выраслі новыя стаханаўцы, як слесары тт. Жыгалка, Івашкевіч, столяр Корда, маляры тт. Асановіч і Наумовіч, якія выконваюць свае заданні на 500—600 процантаў.

Малады машыніст Мінскага дэпо, дэпутат Кагановіцкага райсавета комсамолец тав. Грышук, не гледзячы на маразы, пакрываносаўскую водзіць паязды цяжкой вагі. За 1940 год тав. Грышук зэканоміў 57 тон вугалю, за што атрымаў 1.700 рублёў прэміі. У студзені 1941 года яго брыгада зэканоміла 16 тон вугалю.

Высокія ўзоры работы паказваюць саставіцелі станцыі Мінск-таварная ордэнаносцы тт. Калоша і Штурма. У іх ніколі не бывае аварый. Яны перавыконваюць нормы фарміравання і расфарміравання паяздоў. За выдатную работу ў зімніх умовах саставіцель гэтай станцыі тав. Содэль занесен на Дошку пачота Заходняй чыгункі.

Гр. ВАСІЛЬЕЎ.

Канкрэтныя справы дзержынцаў

БАРЫСАЎ. **(Па тэлефону).** Спаборничаючы з шклозаводам «Нёман», шклозавод імені Дзержынскага дабіўся значных поспехаў у рабоце. Соцыялістычныя абавязацельствы, узятыя рабочымі ў чэсць XVIII Усесаюзнай партканферэнцыі, сістэматычна перавыконваюцца. Студзеньскую вытворчую праграму завод выканаў на 112 проц. З кожным днём павялічваецца лік стаханаўцаў, якія даюць 150—200 проц. нормы.

Перадавой зменай па гупейскаму цэху з'яўляецца змена «Комунар», якой кіруе комуніст Нікалай Шчучка. Студзеньскую вытворчую праграму яна выканала на 112 проц. За сістэматычнае перавыкананне плана змена атрымала пераходны чырвоны сцяг заводскага камітэта.

Рабочыя шліфавальнага цэха з кожным днём множаць свае вытворчыя поспехі. Брыгада Івана Рудзінскага выконвае норму выпрацоўкі на 220 проц., Пятра Рудзінскага на 174 проц., Ефіма Аляксеева — на 168 проц.

Вялікай прадукцыйнасці дабіліся многастаночніцы, якія працуюць на машынках па запраўцы края. Многастаночніца Шыфрына, якая абслугоўвае 9 машынак, выконвае сваю норму на 194 проц., Вавілава — на 170 проц.

Г. ДАШКЕВІЧ.

Прадпрыемствы тэкстыльнай і харчовай прамысловасці перавыканалі студзеньскі план

Разгарнуўшы соцыялістычнае спаборніцтва на дастойную сустрэчу XVIII Усесаюзнай партканферэнцыі, прадпрыемствы тэкстыльнай прамысловасці БССР выканалі студзеньскі план на 106,3 проц. Выпушчана шарсцяных, баваўнянапяровых, ватных і іншых вырабаў на 19.872 тысячы рублёў, пры плане ў 18.701 тысячу рублёў.

Беластоцкія прадпрыемствы выканалі план на 107 проц., віцебская ватная фабрыка — на 127 проц., ільнозаводы мінскага і віцебскага трэстаў — на 119,2 проц.

***

Па Наркамату харчовай прамысловасці студзеньскі план выканан на 105,3 проц. Выпушчана прадукцыі на 26.724 тысячы рублёў, пры плане ў 25.385 тысяч рублёў.

Віцебскі маслабойны завод выканаў месячны план на 131,8 проц., мінскія прадпрыемствы — фабрыка «Комунарка» — на 113,4 проц., піваварны завод «Беларусь» — на 107,1 проц., дражджавы завод «Чырвоная зара» — на 110,5 проц.

Пленум Баранавіцкага абкома КП(б)Б

БАРАНАВІЧЫ, 6 лютага. **(Кар. «Звязды»).** 5 і 6 лютага адбываўся чацверты пленум Баранавіцкага абкома КП(б)Б з удзелам першых і другіх сакратароў райкомаў партыі, старшынь выканкомаў райсоветаў дэпутатаў працоўных і загадчыкаў раённых земельных аддзелаў. Пленум абмеркаваў два пытанні—аб рабоце партыйных арганізацый па рэалізацыі пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб мерапрыемствах па павелічэнню вырабу тавараў шырокага спажывання і харчоў з мясцовай сыравіны» і аб падрыхтоўцы да вясенняй сяўбы.

Па першаму пытанню даклад зрабіў старшыня выканкома абласнога Совета дэпутатаў працоўных тав. Царэнка. Ён адзначыў, што ў мінулым годзе партыйныя і совецкія арганізацыі прарабілі вялікую работу па расшырэнню мясцовай прамысловасці і прамысловай кааперацыі. Адкрыта 66 новых прадпрыемстваў і 164 прамысловыя арцелі. Вялікая колькасць старых прадпрыемстваў адноўлена і рэканструіравана.

Аднак, дакладчык надзвычай заханіўся ізлажэннем поспехаў мінулага года і ні слова не сказаў аб тым, як у абласці практычна ўжо ажыццяўляецца пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб павелічэнні вырабу тавараў шырокага спажывання і харчоў. І гэта не выпадкова. Тав. Царэнка не мог на пленуме нічога путнага сказаць таму, што ў радзе месц усё яшчэ займаюцца агульнымі разважаннямі, а не канкрэтнымі справамі.

Кіраўнікі Мастоўскага, Любчанскага, Быценскага і інш. раёнаў увесь час шумяць, плануюць, намячаюць канкрэтныя мерапрыемствы, а хто і калі іх будзе выконваць — невядома. У Баранавічах доўга думалі над тым, як арганізаваць у горадзе выраб прымусных ігалак. І дадумаліся рабіць іх з струн, якія будуць закупляцца ў розных гарадах Совецкага Саюза. Ці мае гэта што-небудзь агульнага з выкананнем пастановы партыі і ўрада аб выпуску тавараў шырокага спажывання **на базе мясцовай сыравіны?** Безумоўна, не.

Пленум зусім правільна адзначыў, што кіраўнікі асобных прадпрыемстваў і гандлюючых арганізацый не клапоцяцца аб спажыўпту, не ведаюць попыту працоўных і не накіроўваюць сваю дзейнасць на яго задавальненне.

Даклад па другому пытанню зрабіў загадчык абласнога зямельнага аддзела тав. Сарвіра. Ён указаў, што падрыхтоўка да вясенняй пасеўнай кампаніі ў калгасах і адпаасобных гаспадарках праходзіць ляўна нездавальняюча. Па абласці нехапае 487 цэнтнераў насення канюшыны, 532 цэнтнеры вікі, 525 цэнтнераў ільнонасення і многа іншых культур.

Дрэнна абстаіць справа з ачысткай насення. Усяго ачышчана 59 проц. У многіх раёнах, як Клецкім, Воранаўскім, Жалудоцкім і іншых, насенне мае вельмі нізкі процант усхожасці і не адпавядае ўстаноўленай кандыцыі.

Выступіўшыя ў спрэчках тт. Барадулін (старшыня Новамышскага выканкома райсовета), Ванскові́ч (сакратар Стаўбцоўскага райкома КП(б)Б) і іншыя расказалі пленуму аб праробленай рабоце па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню маладых калгасаў.

Па абмеркаваных пытаннях пленум прыняў рашэнні.

Пленум аднадушна выбраў дэлегатам на XVIII Усесаюзную партыйную канферэнцыю першага сакратара Баранавіцкага абкома КП(б)Б Івана Пятровіча Тура.

Сход партыйнага актыва гор. Гомеля

ГОМЕЛЬ, 6 лютага. **(Кар. «Звязды»).** 4—5 лютага адбываўся сход актыва Гомельскай гарадской партыйнай арганізацыі. Актыў абмеркаваў пытанне аб практычных мерапрыемствах па рэалізацыі пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб павелічэнні вырабу тавараў шырокага спажывання і харчоў з мясцовай сыравіны. Даклад па гэтаму пытанню зрабіў сакратар абкома КП(б)Б тав. Жыжанкоў.

Тав. Жыжанкоў указаў на недапушчальна марудное разгортванне работы па рэалізацыі пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б).

Першым у спрэчках выступіў старшыня арцелі «Перамога» тав. Рубінштэйн, які расказаў аб намечаных арцеллю мерапрыемствах па выпуску дадатковай прадукцыі шырокага спажывання.

У сваім выступленні старшыня горвыканкома тав. Караневіч гаварыў аб велізарным уздыме, з якім была сустрэта пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б), аднак нічога не сказаў, што зроблена горвыканкомам для яе рэалізацыі. Кіраўнікі горвыканкома пакуль што абмяжоўваюцца агульнымі разважаннямі. Яны фактычна адарваны ад работы прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці і промкааперацыі.

Змястоўным было выступленне сакратара абкома па прамысловасці тав. Сырамятнікава.

— У бягучым годзе, — гаворыць тав. Сырамятнікаў, — мясцовая прамысловасць і промкааперацыя павінны значна павялічыць выпуск тавараў шырспажыву. Кіраўнікі многіх арцелей няправільна думаюць, што промкааперацыя, працуючы на адыходах, не можа выпускаць добрую прадукцыю. Прадукцыя, якую вырабляюць такія арцелі, зусім нізкаякасная, а гандлюючыя арганізацыі, на жаль, бяруць усё, што ім даюць.

У спрэчках па дакладу тав. Жыжанкова выступіла 14 чалавек. Сход актыва прыняў рэзалюцыю, у якой намечаны канкрэтныя мерапрыемствы па хутчэйшай рэалізацыі пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б).

Рэспубліканская нарада работнікаў механізацыі сельскай гаспадаркі

5 і 6 лютага ў Мінску праходзіла рэспубліканская нарада дырэктароў, старшых механікаў перадавых МТС, галоўных інжынераў абласных земельных аддзелаў і лепшых трактарыстаў. У рабоце нарады прымалі таксама ўдзел навуковыя работнікі станцыі механізацыі і Інстытута торфу Акадэміі навук БССР.

Нарада заслухала паведамленне галоўных інжынераў Магілеўскага, Баранавіцкага, Брэсцкага і Пінскага абліз і Наркамзема БССР аб падрыхтоўцы трактарнага парка да веснавой пасеўнай кампаніі.

Вялікую ўвагу нарада ўдзяліла пытанню пераводу газагенератарных трактараў на тарфяное паліва.

Удзельнікі нарады абавязаліся закончыць рамонт трактараў да XVIII партыйнай канферэнцыі і вызначылі канкрэтныя мерапрыемствы па паляпшэнню трактарных работ і зніжэнню іх сабекошту.

(БЕЛТА).

V з'езд КП(б) Літвы

КАУНАС, 5 лютага. (ТАСС). Сёння вечарам у Доме Чырвонай Арміі адкрыўся V з'езд комуністычнай партыі (большэвікоў) Літвы.

Комуністычная партыя рэспублікі доўгія гады працавала ў падполлі, упершыню з'езд сабраўся ў легальных умовах. Сярод дэлегатаў многа комуністаў-падпольшчыкаў, рад год праседзеўшых у сметонаўскіх турмах.

Тав. Прэйкшас прапануе выбраць пачотны прэзідыум з'езда. Калі ён называе імя таварыша Сталіна, узнікае бурная авацыя. Усе дэлегаты ў адзіным парыве ўстаюць, раздаюцца прывітальныя воклічы ў чэсць вялікага правадыра народаў.

Са справаздачным дакладам аб рабоце ЦК КП(б) Літвы выступіў сакратар ЦК тав. Снечкус. Ён гаварыў аб дапамозе літоўскаму народу брацкіх рэспублік Совецкага Саюза, аб дапамозе таварыша Сталіна, аб баявым шляху комуністычнай партыі Літвы, перших поспехах, атрыманых літоўскім народам пад кіраўніцтвам компартыі ў барацьбе за развіццё соцыялістычнай прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

З велізарным уздымам з'езд паслаў прывітанні таварышам Сталіну і Молатаву.

IV з'езд комуністычнай партыі (большэвікоў) Эстоніі

ТАЛІН, 5 лютага. (ТАСС). Сёння ў Таліне ў тэатры «Эстонія» адкрыўся IV з'езд комуністычнай партыі (большэвікоў) Эстоніі. З'езд адкрыў старэйшы член эстонскай компартыі старшыня Соўнаркома Эстонскай ССР тав. І. Лаурысцін.

Пад гучныя воклічы «ура» і бурныя авацыі ўсёй залы з'езд выбірае пачотны прэзідыум у саставе Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышом Сталіным.

Слова для справаздачнага даклада прадастаўляецца тав. Сярэ. З'езд аднадушна прыняў прывітанні таварышу Сталіну і з'езду комуністычнай партыі (большэвікоў) Літвы.

На гэтым першае пасяджэнне з'езда закрылася.

Абмен ратыфікацыйнымі граматамі гандлёвага дагавора паміж СССР і Славакіяй

БРАТЫСЛАВА, 5 лютага. (ТАСС). 4 лютага ў Братыславе адбыўся абмен ратыфікацыйнымі граматамі дагавора аб гандлі і суднаходстве, заключанага паміж СССР і Славакіяй у Маскве 6 снежня 1940 г.

Пратакол абмену з боку СССР падпісаў паўпрэд СССР у Славакіі тав. Пушкін, а з боку Славакіі прэм'ер і міністр замежных спраў Тука.

Па Совецкай краіне

Група жанчын, узнагароджаных за доблесць і мужнасць, праяўленыя ў барацьбе з фінскай белагвардзейшчынай. Злева направа — **Б. Баранава** — работніца дзіцячага сада, медыцынская сястра **Е. Уманская**, медыцынская сястра **В. Шчэпіна** і **І. Іванова** — работніца арцелі «Промодежда» горада Старая Руса, Ленінградскай вобласці.

Фото А. Грыбоўскага. (Фото ТАСС).

У СОВЕЦКАЙ РЫГЕ

У Рыге пачалі працаваць 6-месячныя курсы па падрыхтоўцы ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Займаюцца 400 чалавек, галоўным чынам рабочая і сялянская моладзь.

50 ТЫСЯЧ КІЛОМЕТРАЎ БЕЗ КАПІТАЛЬНАГА РАМОНТУ

ІЖЭЎСК. Перадавыя машыністы дэпо Агрыз Казанскай чыгункі сустракаюць XVIII партканферэнцыю новымі поспехамі. Старэйшы машыніст Захараў з сынам Фёдарам давялі прабег свайго паравоза без капітальнага рамонту да 50.689 кілометраў пры норме ў 5 тысяч. Яны зэканомілі на рамонце звыш 16 тысяч рублёў. Паравоз у добрым стане.

ПЕРАДВЯСНОВЫЯ ДНІ У НОВЫХ РАЁНАХ МАЛДАВІІ

КІШЫНЁЎ. На поўдні Малдавіі надышлі перадвясновыя дні. У Бендэрскім павеце 6.574 гектары зямлі займаюць фруктовыя сады. Яны зараз прыводзяцца ва ўзорны парадак.

Гэтай вясной па ўраллівых бесарабскіх землях пачнуць працаваць першыя МТС і звыш сотні нядаўна арганізаваўшыхся калгасаў. У 7 школах навучаюцца трактарнай справе 832 селяніны — нядаўнія беднякі і батракі, упершыню ўбачыўшыя трактар. Падрыхтоўваюцца шоферы, токары, слесары. (ТАСС).

АКАДЭМІЧНЫЯ СЛОЎНІКІ

Інстытут усходазнаўства Акадэміі навук СССР здаў у друк першы поўны мангольска-рускі слоўнік аб'ёмам звыш 160 друкаваных аркушаў. Ён уключае каля 100 тысяч слоў. Над складаннем гэтага слоўніка працавала брыгада лінгвістаў-прафесараў, аспірантаў, навуковых работнікаў, студэнтаў пад кіраўніцтвам члена-карэспандэнта Акадэміі навук СССР Н. Н. Попе.

У Акадэміі навук СССР і яе філіялах заканчваецца складанне руска-адыгейскага, руска-ненецкага, руска-кумыкскага, руска-армянскага, якуцка-рускага, руска-азербайджанскага і іншых слоўнікаў.

ЧАЙНАЕ МАСЛА

БАТУМІ. На утыльзаводзе Наркоммясцпрома Аджарскай АССР у Батумі ўступіў у эксплуатацыю маслабойны цэх, які будзе выпускаць у год больш 300 тон чайнага масла з адыходаў пасеўнага матэрыялу чайных плантацый.

Сярод пагранічнікаў Н-скай часці (Сярэдне-Азіяцкая граніца) шырыцца спаборніцтва на права несці пачотную вахту ў дзень адкрыцця XVIII Усесаюзнай канферэнцыі ВКП(б).

На здымку — выдатнікі баявой і палітычнай падрыхтоўкі тт. Шэргозы Джусубаў і Н. Смірноў у нарадзе.

Фото Л. Вільчынскага. (Фото ТАСС).

ГІСТОРЫЯ АДВАЖНАЙ ЧАСЦІ

ЗАБАЙКАЛЬСКАЯ ВАЕННАЯ АКРУГА. Н-ская часць Забайкальскай ваеннай акругі мае слаўную гісторыю. У 1939 годзе яна адважна білася з ворагамі соцыялістычнай бацькаўшчыны. За праяўленыя храбрасць і мужнасць 85 процантаў яе байцоў і камандзіраў узнагароджаны ордэнамі і медалямі Совецкага Саюза.

Адважныя байцы рашылі напісаць гісторыю сваёй часці. Удзельнікі баёў Крывалобчук, Кузняцоў і іншыя запісалі ўспаміны, адрэдагавалі матэрыял. Гэтымі днямі зборнік выйшаў у свет. У ім змешчаны апавяданні ўдзельнікаў баёў, многа фатаграфій, нарысаў.

ПАСЕЎНЫЯ РАБОТЫ У ТУРКМЕНІІ

АШХАБАД. У Туркменіі цёплае надвор'е. Паўсямесна ідзе сяўба пшаніцы і ячменю. У Серахскім раёне да 1 лютага засеяна 7230 гектараў. Калгасы, абслугоўваемыя першай Тэджэнскай МТС, сяўбу яравых закончылі. Засеяна 8.900 гектараў. На плошчы ў 8.550 гектараў працавалі трактарныя сеялкі.

Маскоўскі ордэна Леніна электралямпавы завод упершыню ў СССР стварыў электралямпу магутнасцю ў 20 кіловат і рыхтуе да XVIII Усесаюзнай партканферэнцыі лямпы ў 25—30 кіловат.

На здымку: старшыня інжынеры-даследчыкі ордэнаносец Г. Садоўскі (злева) і М. Камароў — нам. сакратара партбюро завода — ля 20-кіловатнай лямпы.

Фото А. Межуева. (Фото ТАСС).

РЭСПУБЛІКАНСКІ ЗЛЁТ МАЛАДЫХ ПЕРАДАВІКОЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

ЧЭБАКСАРЫ. Закончыўся рэспубліканскі злёт маладых перадавікоў сельскай гаспадаркі. 280 дэлегатаў прыбылі на лыжах, прайшоўшы па 50—200 кілометраў.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ПАЛЕПШЫЦЬ ПАРТЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА ШКОЛАМІ ФЗА

Праз чатыры месяцы школы ФЗА выпусцяць першую партыю будаўнікоў—цесляроў, каменшчыкаў, штукатураў, слесараў, водаправодчыкаў, электраманцёраў. За параўнаўча кароткі тэрмін — поўтора, школы павінны не толькі тэхнічна падрыхтаваць будучых рабочых, але і прывіць ім пачуццё любві да сваёй прафесіі, навыкі высокай культуры ў рабоце.

Дапамагчы школам ФЗА выканаць гэту вялікую дзяржаўную задачу абавязаны, перш за ўсё, гаркомы і райкомы КП(б)Б.

Барысаўскі гарком партыі вынес не адно рашэнне аб падрыхтоўцы да пачатку заняткаў і аб далейшай рабоце школ ФЗА. Але недастатковая праверка выканання і недастатковая патрабавальнасць гаркома часта прыводзяць да таго, што яго рашэнні астаюцца не выкананымі. К пачатку заняткаў не быў закончан рамонт будынкаў інтэрнатаў і вытворчых карпусоў школ. У пэхах пехапала станкоў, інструментаў, матарыялаў. Па гэтай прычыне ў школе ФЗА № 10 своечасова не маглі пачаць планамерную вучобу.

У школах і зараз пехапае абсталявання: станкоў, інструментаў, матэрыялаў.

У слясарным цэху школы № 10 майстры выкладаюць толькі тыя дысцыпліны, якія можна ўсвоіць пры дапамозе тых нямногіх інструментаў, якія мае школа. Тут няма токарных станкоў, напільнікаў, свёрлаў і т. д.

Булучыя штукатуры яшчэ не бачылі сапраўднага штукатурнага матэрыяла — алебастра, вапны. Каменшчыкі ўжываюць для змазвання цэглы простую гліну замест цэмента.

Будучыя электраманцёры вымушаны карыстацца пры практычных работах па правядзенню электрычнасці простым шпагатам.

Практычная работа вучняў мае вялікае значэнне ў справе падрыхтоўкі будучых рабочых. У гэтых адносінах гарком КП(б)Б павінен аказаць школам вялікую дапамогу. У лютым месяцы вучні выходзяць на практычную работу на будоўлі. Сюды яны павінны прыйсці, ужо ўмеючы самастойна выконваць некаторыя работы. Пачаўся сур'ёзны этап у падрыхтоўцы будаўнікоў. А барысаўскія школы дрэнна падрыхтаваліся да яго. К 15 студзеня яны павінны былі заключыць дагаворы з гаспадарнікамі на рамонтна-будаўнічыя работы. Але дагаворы не заключаны яшчэ і зараз. Дырэктары школ тт. Фідэльгольц і Свірыцкі не праяўляюць неабходнай ініцыятывы ў гэтай справе. Да дырэктара школы № 23 тав. Фідэльгольца звярталіся з просьбай правесці слясарна-рамонтныя работы ў дзіцячых яслях шклозавода іх. Дзержынскага. Па незразумелых прычынах т. Фідэльгольц не згадзіўся выканаць гэту работу.

Рашаючую ролю ў справе падрыхтоўкі будучых рабочых адыгрываюць выкладчыкі. Гарком КП(б)Б падабраў у асноўным нядрэнны састаў майстроў. Заняткамі кіруюць вопытныя, кваліфікаваныя будаўнікі. Але педагагічнымі навыкамі валодаюць нямногія з іх.

Гарком КП(б)Б. займаючыся работай школ, мала ўвагі звяртаў на методыку вытворчага абучэння вучняў. Майстры мала займаюцца прывіццём вучням культурных навыкаў, дысцыплінаванасці ў рабоце. Мы бачылі, як у слясарскім пэху школы № 10 вучань цясаў бервяно. Тапор ён трымаў не за тапарышча, як гэта робяць усе цесляры, а за абух. Стаяўшы тут-жа, побач, майстар не зрабіў вучню ніякай заўвагі. А гэта-ж няправільнае палажэнне увойдзе потым у прывычку. Другі вучань даўбіў у бервяне долатам адтуліну. Драўляная ручка долата раскалолася, а вучань прадаўжаў біць абухом талара па металічнай частцы інструмента, прыводзячы, такім чынам, яго ў непрыгоднасць. Майстар таксама прайшоў міма, нічога не сказаўшы.

Трэба з першых-жа дзён работы выхоўваць у вучняў беражлівыя адносіны да свайго інструмента, прывучаць іх да культурнага ўтрымання станка і рабочага месца. Майстры, на жаль, у гэтых адносінах не праяўляюць вучням сур'ёзных патрабаванняў. У многіх вучняў слясарнага цэха школы № 10 у час работы вакол станкоў скапляецца многа рознага хламу —трап'я, шчэпак, паперы, непатрэбных металічных абрэзкаў. Міма іх па некалькі раз у дзень праходзяць майстры, старшы майстар, намеснік дырэктара школы па палітчасці — і ні адной заўвагі.

Партыйныя арганізацыі нясуць поўную адказнасць за комуністычнае выхаванне вучняў. У інтэрнатах, якія павінны стаць цэнтрам масава-выхаваўчай работы, неабходна арганізаваць культурны адпачынак вучняў, сістэматычна праводзіць гутаркі, голасныя чыткі газет і журналаў.

Гарком КП(б)Б ва ўсіх сваіх рашэннях аб школах ФЗА запісваў пункт аб разгортванні культмасавай работы. Але канкрэтнай дапамогі ў арганізацыі гэтай работы ў школе ён не аказаў. 4-га снежня гарком запісаў у сваёй пастанове: «...неадкладна аформіць клубы, забяспечыць іх партрэтамі правадыроў, плакатамі, шашкамі, даміно...» Прайшло ўжо два месяцы, але клубы да гэтага часу не афармлены. У добрым памяшканні клуба школы № 10 незашклёны вокны, брудна, холадна, няўтульна. Вучні ў клуб, зразумела, не заходзяць.

Гарком КП(б)Б у снежні абавязаў сакратара гаркома ЛКСМБ тав. Крупкіна выдзеліць комсамольцаў-актывістаў для правядзення палітычна-масавай работы ў школах. Праз некаторы час тав. Крупкіну паставілі на від за невыкананне дырэктывы, але становішча ад гэтага не змянілася. Культурна-масавая работа ў школах не наладжана.

Партыйныя і комсамольскія работнікі ў школах ФЗА і ў асаблівасці ў інтэрнатах — рэдкія госці. Вучні пяслярэжскага цэха школы № 10 расказваюць, што ў іх інтэрнаце за два месяцы ніхто не правёў гутаркі, не арганізаваны калектыўныя чыткі газет, журналаў, кніг. Ні разу не дэманстраваліся кінакарціны. Пасля работы вучні прадастаўлены самім сабе.

У школе ёсць многа лыж, а ваенна-фізкультурная работа не арганізавана.

Пры школах створаны комсамольскія арганізацыі. Нядаўна гарком КП(б)Б афармініў пярвічныя партыйныя арганізацыі. Іх патрэбна зараз аказаць неабходную дапамогу ў рабоце.

Школы ФЗА закліканы вырашыць вялікую дзяржаўную задачу — падрыхтаваць для соцыялістычнай прамысловасці кваліфікаваныя кадры рабочых масавых прафесій. Партыйныя арганізацыі нясуць поўную адказнасць за ажыццяўленне гэтай задачы.

М. ПАЎЛЮЧЭНКАЎ.

У НЕСВІЖЫ НЕ КІРУЮЦЬ ПРАПАГАНДАЙ

У ўпаўнаважанага Наркамзага па Несвіжскаму раёну тав. Дулесава спыталі:

— Што вы ведаеце аб Гегелю?

— Ён быў пісьменнікам.

— А што вы можаце сказаць аб Фейербаху?

Дулесаў зняў шапку, насавой хустачкай прадзёр потны лоб і адказаў:

— З гэтым таварышом я не знаём (!?)

— А як вы, наогул, вывучаеце Кароткі курс?

— Прызнацца вам па совесці, у мяне і без Кароткага курса работы па вушы.

Прадаўжаць размову па тэарэтычных пытаннях было бескарысным. Намеснік загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі Баранавіцкага абкома КП(б)Б тав. Калмыкоў пагутарыў з тав. Дулесавым аб яго жыцці і рабоце. Аказалася, што Дулесаў палітычна непісьменны і нязвіты чалавек. Ён нават не памятае галоўнейшых рашэнняў партыі і ўрада. Забыў і пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб змяненнях у палітыцы заготовак і закупак сельскагаспадарчых прадуктаў», якую абавязан на практыцы выконваць.

На жаль, гэта — не адзінкавы выпадак. У Несвіжы многа таварышоў з раённага партыйнага, совецкага і гаспадарчага актыва зусім не вучацца. Вось прыклады. Начальнік раённага аддзялення міліцыі тав. Зінькоў, спасылаючыся на «вечную» занятасць, ужо каля года нічога не чытае. Падручніка па гісторыі партыі ён і ў рукі не браў.

Загадчык райана тав. Матвейчык палітычна і культурна не расце. Ён не мае ніякага жадання ліквідаваць сваю тэарэтычную адсталасць. Не дзіўна пасля гэтага, што ён не карыстаецца сярод настаўніцтва ніякім аўтарытэтам і не забяспечвае кіраўніцтва школамі раёна.

Не працуе над сабой таксама загадчык раённай канторай «Заготлён» тав. Чэрушка і многія іншыя. Усе гэтыя таварышы, як відаць, забылі, што «чым вышэй палітычны ўзровень і марксісцка-ленінская свядомасць работнікаў любой галіны дзяржаўнай і партыйнай работы, тым вышэй і пладатворней сама работа, тым эфектыўней рэзультаты работы...» (Сталін). Не авалодваючы марксісцка-ленінскай тэорыяй, яны не могуць крытычна, па-марксісцку вывучыць культурную спадчыну мінулага, не ведаюць законаў грамадскага развіцця і адстаюць ад жыцця.

Практыка прапагандысцкай работы паказала, што там, дзе добра пастаўлены кантроль і праверка па сутнасці, як комуністы і, у першую чаргу, партыйны і гаспадарчы актыў вывучаюць асновы марксізма-ленінізма, — там людзі самастойна працуюць над сабой. У Несвіжы гэтага няма. Тут раўнадушна адносяцца да кантролю палітычнай самаадукацыі комуністаў.

Гэта тлумачыцца перш за ўсё тым, што асобныя партыйныя кіраўнікі самі дрэнна працуюць над авалоданнем большэвізмам. Другі сакратар райкома партыі тав. Будкевіч, напрыклад, вельмі марудна вывучае «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». Ён закапспектываваў за два з лішнім годы ўсяго толькі чатыры раздзелы падручніка. І, што горш за ўсё, тав. Будкевіч не памятае нават таго, што ўжо «вывучыў». За ўвесь час ён не прачытаў ні аднаго твора Леніна. Не знаём ён таксама з папулярнымі творамі мастацкай літаратуры.

Няма жадання і настойлівасці ў вучобе і ў тав. Жукава, трэцяга сакратара РК КП(б)Б. Па яго словах, апошнія два месяцы ён зусім не вучыцца, з прычыны «перагрузкі».

Вядома, такія таварышы не могуць з поспехам кіраваць партыйнай прапагандай. Бо яны самі не выконваюць патрабаванняў Статута ВКП(б), не працуюць над павышэннем сваіх ведаў, не вывучаюць глыбока і ўтуміва большэвіцкую тэорыю.

Я. КАЧАН.

БЮРО АБКОМА КП(б)Б АБ РАБОЦЕ АБЛАСНОЙ ГАЗЕТЫ

ВІЛЕЙКА. (Кар. «Звязды»). На пасяджэнні бюро абкома КП(б)Б абмеркавана пытанне аб асвятленні ў абласной газеце «Сялянская газета» партыйнага жыцця і прапагандзе на яе старонках марксізма-ленінізма. Бюро абкома партыі адзначыла, што пытанні партыйнага жыцця не занялі вядучага месца на старонках газеты, асвятляюцца бессістэмна і павярхоўна.

Газета не ўвязвае сваю работу з тымі мерапрыемствамі, якія праводзяцца абкомам партыі. Нядаўна ва ўсіх партыйных арганізацыях прайшлі справаздачныя сходы, а газета зусім не асвятляла гэтай важнейшай падзеі ў жыцці партыйнай арганізацыі вобласці. У партыйных арганізацыях праведзена глыбокая праверка становішча партыйнай прапаганды і агітацыі, але гэта не знайшло свайго адлюстравання на старонках газеты.

Навакол газеты не створан аўтарскі актыў з партыйнага актыва. У газету пішуць ад выпадку да выпадку толькі асобныя таварышы з партыйнага актыва.

Бюро абкома КП(б)Б абавязала рэдактара «Сялянскай газеты» тав. Кулінковіча ліквідаваць адзначаныя недахопы і наменіла практычныя мерапрыемствы па паляпшэнню ідэйна-палітычнага зместу газеты.

УСЯМЕРНА РАЗВІВАЦЬ ВЫРАБ ТАВАРАЎ ШЫРОКАГА СПАЖЫВАННЯ І ПРАДУКТАЎ ХАРЧАВАННЯ

★★★

НАШЫ ПЛАНЫ

Наш райпромкамбінат арганізаваўся ў сакавіку мінулага года. Ён аб'ядноўваў тады два млыны, якія малолі 70 цнт. зярна ў дзень, і 2 прадзільныя цэхі, якія ледзь-ледзь выпускалі ў дзень 150 кг. нітак. На гэтых прадпрыемствах было занята ўсяго 25 рабочых.

Праз месяц-два арганізавалі сталярна-мэблевы цэх, слясарную майстэрню і майстэрню для вырабу абодзяў. Пазней пачаў працаваць бандарны цэх. У ліпені пусцілі ў ход два цагельныя заводы магутнасцю адзін — на 35 тыс. цаглін, другі — на 40 тыс.

Праз некаторы час былі пушчаны кафельны завод, цэх па вырабу валёнак і лямцаў, цэх ганчарных вырабаў, які выпускае да 15 відаў прадукцыі. Запрацаваў таксама чарапічны завод, які стаяў на працягу двух год.

Да канца трэцяга квартала мінулага года камбінат еднаў ужо 17 прадпрыемстваў і пэхаў. Колькасць рабочых узрасла да 200 чалавек, а разам з сезоннікамі да 300 чалавек.

Пачалі здабываць торф. У Ружанах раней ніколі гэтай справай не займаліся. У мінулым годзе наш камбінат здабыў 2 тыс. тон торфу. Усе прадпрыемствы і цэхі камбіната пераведзены на мясцовае паліва.

Немалым дасягненнем з'яўляецца асваенне выпуску лыж. У мінулым годзе намі выпушчана іх 1.320 пар, а ў бягучым годзе мы выпусцім не менш 15 тыс. пар лыж. Вырабам лыж будзе занят спецыяльны цэх. Нашы лыжы ў 1941 годзе будуць камплектнымі, г. зн. будуць мець крапленні і палкі з акоўкай.

Камбінат у цэлым выканаў план мінулага года на 133,8 проц., даўшы прадукцыі на 1 млн. 179 тыс. руб. у цэнах 1926—1927 гг.

Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 9 студзеня абавязвае нас працаваць яшчэ лепш і стварае для гэтага ўсе ўмовы.

Якія мерапрыемствы мы намячаем для рэалізацыі гэтай гістарычнай пастановы?

Аправа расшырэння ўжо існуючых пэхаў і паляпшэння іх работы, мы намячаем адкрыць многа новых пэхаў і асвоіць рад новых прадметаў шырспажыву. Гэта нам падказалі самі рабочыя. Рабочы сталярнага цэха тав. Маліпэўскі, напрыклад, унёс прапанову арганізаваць выпуск барон. Тт. Корніч і Пракапеня прапанавалі вырабляць рашоты з ліпавай кары і т. д. Гэтыя прапановы ўлічаны ў плане на бягучы год.

У гэтым годзе мы адкрываем вяровачны цэх, які будзе працаваць на сыравіне заказчыка; яго магутнасць — 100 тон вяровак у год. Арганізуем таксама пэх па вырабу школьных прылад, шашак, шахмат. Ён будзе працаваць выключна на адыходах сталярнага і металічнага пэхаў камбіната. Калёсна-абодны цэх выпусціць у гэтым годзе 200 вазоў, 500 саней, 200 калёс і каля 1000 дуг. Валяльны цэх, апрача валёнак, будзе вырабляць лямец для хамутоў.

Наш раён багат лазой, з якой можна вырабляць многа добрых рэчаў хатняга ўжытку. Вясной у нас будзе арганізавана майстэрня плянёных вырабаў. Яна будзе вырабляць каркіны, этажэркі, крэслы, цвяточніцы.

На цагельных заводах будуюцца дзве новыя печы, якія дазволяць падвоіць выпуск цэглы.

Калёсна-абодны і вяровачны цэхі пусцім да дня адкрыцця XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі.

Трэба сказаць і аб нашых недахопах. Да іх, перш за ўсё, адносіцца недастатковая механізацыя прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці. Ва ўсіх цэхах, за выключэннем сталярнага, работа праводзіцца яшчэ ручным спосабам. Гэта намнога падаражае сабекошт нашай прадукцыі. Вось, напрыклад, мы адпускаем гандлёючым арганізацыям лыжы па 21 рублю пара. Калі-б у нас было такое нескладанае механічнае абсталяванне, як фрэзерны станок і лентачная піла, мы прадавалі-б іх па значна меншай цане. Тое-ж можна сказаць і аб многіх вырабах, якія выпускае наш камбінат.

Мала дапамагае нам абласны аддзел мясцовай прамысловасці. Да гэтага часу ён не наклапаціўся ўстанавіць у нас нормы выпрацоўкі. Гэтую работу мы праводзім па свайму ўтледжанню.

Д. Л. РУБІНОВІЧ,
дырэктар Ружанскага камбіната Брэсцкай абласці.

★

НЕСКАРЫСТАНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Мінскі сельскі раён мае велізарныя сыравінныя рэсурсы. На жаль, яны выкарыстоўваюцца вельмі слаба.

Яшчэ нядаўна сяляне прылягаючых да Мінска вёсак запаўнялі гарадскія рынкі бандарнымі вырабамі, гліняным пасудам і т. д. Цяпер гэтыя прадметы рэдка калі знойдзеш на рынку.

У калгасе імені Сталіна, Кайкаўскага сельсовета, ёсць свой смалакурны завод, у калгасе «Чырвоны партызан» гэтага сельсовета — смалакурны і чарапічны заводы, у калгасе «Першае мая» — цагельны завод. Але ні адно з гэтых каштоўных і прыбытковых прадпрыемстваў поўнасцю не працуе.

Пры правільным скарыстанні абсталявання нават існуючыя зараз калгасныя прадпрыемствы могуць поўнасцю забяспечыць раён драўнінным вугалем, колемазззю, дзёгцем, скіпідарам і ў значнай меры цэглай і чарапіцай.

Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб мерапрыемствах па павелічэнню вырабу тавараў шырокага спажывання і харчоў з мясцовай сыравіны адкрывае велізарныя магчымасці расшырэння існуючых і арганізацыі новых прадпрыемстваў. Райком партыі і райвыканком намецілі канкрэтныя мерапрыемствы па рэалізацыі гэтай пастановы. Намечана значнае расшырэнне і адкрыццё новых пэхаў па вырабу гонты і дранкі пры Астрашыцка-Гарадзецкім промкамбінаце. Сталярна-мэблевая майстэрня камбіната дасць у гэтым годзе 5.000 парніковых рам, 800 школьных парт, 200 школьных дошак, кухонныя сталы і табурэткі. Цагельны завод пасля рэканструкцыі дасць 1.200 тысяч штук цэглы ў год; арганізоўваецца вытворчасць гліняных пасуды. Хутка пачнецца будаўніцтва смалакурнага завода, адкрываюцца бляшаная майстэрня і майстэрня па апрацоўцы шэрсці і аўчын.

Райспажыўсаюз адкрывае ў Самахвалавічах завод газіраваных вод і новы засолачны пункт. Значна павялічваецца колькасць прадпрыемстваў промкааперацыі. У калгасах і соўгасах раёна адкрываюцца 5 новых шавецкіх арцелей.

Мясцовая прамысловасць Мінскага сельскага раёна можа і павінна забяспечыць прадметамі шырокага спажывання і прадуктамі харчавання не толькі патрэбы сельскага насельніцтва, але і ў значнай меры працоўных горада.

Для гэтага ёсць усе магчымасці, трэба толькі ўмела і па-дзелавому скарыстаць іх.

І. ПУЧЫНСКІ.

Новыя віды прадукцыі

ВАЛОЖЫН. Паўтара месяца назад смалакурная арцель «Пабеда» асвоіла выпуск двух відаў новай прадукцыі—галіпота і карбалеіна. На сёнешні дзень арцель дала гэтай прадукцыі на 17.719 рублёў. Гоншчыкі арцелі Фама Зверынскі, Віктар Рыснік і Павел Новік выконваюць дзённае заданне на 125—180 процантаў.

Рэалізуючы пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб мерапрыемствах па павелічэнню вырабу тавараў шырокага спажывання і харчоў з мясцовай сыравіны, смалакурная арцель у хуткім часе асвоіць выраб воцату з скіпідарнай вады, гуталіна і дзёгця, будзе пабудаван новы цэх па выпрацоўцы калёснай мазі. Значна пашыраецца бандарны цэх.

А. НЕСЦЯРОНАК.

Двухстаночніца Пова-Беліцкай запалкавай фабрыкі «Везувій» (Гомельская обл.) А. Кавалёнка, стаўшы на вахту ў чэсць XVIII Усесаюзнай партканферэнцыі, выконвае норму на 220 проц.

Фото А. Шаевіча. (БЕЛТА).

Стахананец-слесар загатоўчага цэха дэпо Магілёў В. Барысаў, уключыўшыся ў соцспаборніцтва імені XVIII канферэнцыі ВКП(б), выконвае норму на 300 проц.

Фото А. Вульфовіча. (БЕЛТА).

Расшыраем асартымент

Вынікі работы прамысловай кааперацыі і райпромкамбінатаў Брэсцкай абласці за мінулы год паказваюць, якія вялікія магчымасці ёсць у нас для расшырэння выпуску тавараў шырокага спажывання. Калі ў 1940 г. Аблмногапромсаюз даў прадукцыі на 17.471 тыс. руб., то сёлета ён зможа даць прадукцыі папыранага асартымента не менш як на 25 млн. рублёў.

У гэтым годзе намечана значнае расшырэнне прадпрыемстваў промкааперацыі. У Брэсце, Сямяцічах, Шэрашове, Камянцы, Дзівіне, Бярозе адкрыюцца дадатковыя цэхі па рамонту металавырабаў. Намечана пабудова абознай майстэрні ў Пружанах. За год яна дасць 800—1000 цялег. Значна павялічваецца асартымент такіх вырабаў, як падковы, ухваты, заслонкі, трыножкі, лемехі, адвалы, тапары, малаткі, лыжкі, вёдры. Будзе асвоен выпуск шахмат, даміно, гузікаў, грэбняў, пячотак, расчосак і т. д. За кошт скарыстання адыходаў Гайнаўскага хімзавода будзе павялічан выпуск мыла, асвоена вытворчасць гуталіна, сінькі, канторскага клею, сургуча і воску для шавецкіх арцелей. З адыходаў скураных заводаў і салатопаў арганізуецца выпрацоўка сталярскага клею.

У Брэсце, Кобрыне, Высокім і Гайнаўцы адкрыюцца скупачныя пункты, у Жабінцы, Шэрашове і Дзівіне — швейныя арцелі.

Па сістэме Аблмясцпрома ў 1941 г. будзе выпушчана прадукцыі больш чым на 7 млн. руб. Значна расшыраецца выраб тавараў шырокага спажывання па Лесапрэдхімсаюзу і Аблкаапінсаюзу і выраб прадуктаў харчавання за кошт мясцовых рэсурсаў. Звернута ўвага на скарыстанне мясцовага паліва. Калі ў 1940 г. прадпрыемствы Аблмясцтопа здабылі 5 тыс. тон торфу, то сёлета яны дадуць 32 тыс. тон.

І. САЛАВЕЙ,
старшыня абласной планавай камісіі.

Адкрываюцца новыя цэхі

У Пухавіцкім раёне ёсць багатыя рэсурсы для развіцця мясцовай прамысловасці.

На базе мясцовай сыравіны ў раёне арганізоўваецца цагельная вытворчасць, расшыраюцца сельскагаспадарчыя майстэрні райпромкамбіната. У 1941 годзе яны выпусцяць 250 саней, 600 дуг і многае іншых абозных прылад.

Пры арцелі «Чырвоны будаўнік» адкрываецца цэх па выпуску сталоў, шафаў і іншай мэблі, пры шавецкай арцелі «Звязда» — пэхі па апрацоўцы скур і аўчын. Ужо зараз пачата загатоўка і ўстаноўка абсталявання. Пры арцелі «Чырвоны гармонік» адкрываюцца цэхі па рамонту веласіпедаў, швейных і пішучых машын і патэфонаў. Значна павялічваецца выпуск гармонікаў. Пры швейных арцелях «Кімінтэрн» і імені Кірава абсталёўваюцца спецыяльныя цэхі па хімічнай чыстцы і афарбоўцы адзення.

Сёлета значна расшыраецца выпуск безалкагольных напіткаў, арганізоўваецца вытворчасць вітамінных сокаў з морквы. Пры сталовых райспажыўсаюза адкрыты адкормачныя пункты на 187 свіней.

А. ДРЫКЕР.

Бібліяграфія

Дакументы па гісторыі грамадзянскай вайны ў СССР

У гісторыі Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі і грамадзянскай вайны ў СССР 1918 год з'яўляецца найменш вывучаным.

Першы паход Антанты пачаўся вясной 1919 года. Што-ж адбывалася ў нашай краіне ў 1918 годзе? Як жыла, як змагалася маладая Совецкая рэспубліка перад тварам шматлікіх ворагаў, паспрабаваўшых расправіцца з ёю на другі дзень пасля прыходу да ўлады рабочых і сялян?

Адказ на гэтыя і на рад іншых шматлікіх пытанняў гісторыі жыцця і барацьбы маладой совецкай улады дае кніга, падрыхтаваная да друку калектывам навуковых работнікаў Галоўнай рэдакцыі «Гісторыі грамадзянскай вайны ў СССР» (Дакументы па гісторыі грамадзянскай вайны ў СССР. Т. І. Пад рэдакцыяй І. Мінца і Е. Гарадзецкага. Дзяржпалітвыдат. 1940. 544 стар.).

Першы раздзел кнігі — «Трыумфальнае шэствіе совецкай улады» — знаёміць нас з выдатнымі дакументамі барацьбы совецкай улады супроць шматлікіх ворагаў, выступіўшых на другі дзень пасля перамогі пролетарскай рэволюцыі. Разгром першага антысовецкага мецяжа Керэнскага — Краснова, злом старога дзяржаўнага апарата, наладжванне работы органаў совецкай улады, барацьба з контррэволюцыяй на Дану і разгром каледзінішчыны, разгром Цэнтральнай рады і дутаўшчыны, нарэшце роспуск Устаноўчага схода і ўцвярджэнне асноў першай совецкай Канстытуцыі — такія этапы грандыёзнай барацьбы першых месяцаў існавання Совецкай рэспублікі, з якой яна вышла пераможнай.

Партыя Леніна — Сталіна вывела краіну з хаоса першай імперыялістычнай вайны.

У кнізе прыводзіцца рад вельмі цікавых дакументаў і матэрыялаў аб барацьбе большэвікоў за мір.

Пасля заключэння Брэсцкага міру совецкі ўрад неадкладна скарыстаў перадышку. У кнізе публікуюцца шматлікія дакументы, якія сведчаць аб тым, як рабочы клас пад кіраўніцтвам партыі ўзяўся за соцыялістычную будоўлю.

Асаблівую ўвагу партыя аддавала з першых дзён існавання совецкай улады пытанням працоўнай дысцыпліны і падняцця прадукцыйнасці працы.

27 сакавіка 1918 года на пасяджэнні прэзідыума ВСНГ з удзелам В. І. Леніна абмяркоўвалася пытанне аб працоўнай дысцыпліне. Пасля спрэчак, у якіх удзельнічаў В. І. Ленін, было вырашана выпрацаваць праект рэзалюцыі. Ленін унёс рад паправак і дапаўненняў да гэтага праекта. Ён прапанаваў увесці здельную аплату працы, патрабаваў строгіх карных мер за незахоўванне працоўнай дысцыпліны. Праект быў перапрацаван у духу ленінскіх указанняў.

Аб'ядноўваўшае дзейнасць органаў народнай гаспадаркі ў 7 паўночных губернях бюро Соўнаргаса Паўночнага раёна, на чале якога стаяў В. М. Молатаў, прыняла рашэнне: «У імя абароны агульнапролетарскіх інтарэсаў неабходна падняць прадукцыйнасць працы, хоць-бы для гэтага прыйшлося ўжыць суровыя рэпрэсіі» (стар. 138).

Ворагі совецкай улады—кадэты, меншавікі, эсэры, трацкісты і бухарынцы — павялі жорсткую барацьбу супроць ленінскага плана прыступу да соцыялістычнага будаўніцтва. Прыкрываючыся «левымі» фразамі, антыленінскія элементы абаранялі кулака, лодыра, спекулянта.

Большэвіцкая партыя разграміла здрадніка, разгарнула соцыялістычнае будаўніцтва ў горадзе, правяла жорсткую барацьбу супроць кулацтва ў вёсцы, адлюстраваную ў кнізе, у раздзеле «Арганізацыя «крыжовага паходу» супроць кулака».

На арганізацыю харчовай справы ў краіне было паслана некалькі тысяч найбольш свядомых перадавых рабочых на чале з таварышом Сталіным і лепшымі людзьмі большэвіцкай партыі. Выдатныя дакументы гавораць аб той велізарнай дзейнасці, якую разгарнуў таварыш Сталін у Царыцыне па апрацоўцы харчоў з паўднёвых раёнаў краіны ў прамысловыя цэнтры. Са зводкі, апублікаванай у кнізе, відаць, што толькі за адзін чэрвень 1918 года таварышом Сталіным было адпраўлена з Царыцыны 2379 вагонаў харчовых грузаў (стар. 160).

К гэтаму часу (лета 1918 г.) на Поўначы, на Далёкім Усходзе высадзіліся англа-французскія, амерыканскія, японскія войскі. 25 мая ўспыхнуў чэхаславацкі мяцеж, падрыхтаваны і кіруемы англа-французскім штабам. Пачалася паласа контррэволюцыйных, эсэраўскіх мецяжоў. Дакументы паглядна паказваюць, як пад кіраўніцтвам і з дапамогаю інтэрвентаў арганізаваліся сілы ўнутранай контррэволюцыі, як шматлікія афіцыяльныя і неафіцыяльныя прадстаўнікі замежных імперыялістаў — Нулансы, Локарты і іншыя — накіроўвалі дзейнасць контррэволюцыйных падпольных арганізацый, снабжалі іх грашыма і ўзбраеннем.

6 ліпеня 1918 г., калі засядаў V Усерасійскі з'езд советаў, які павінен быў зацвердзіць першую совецкую Канстытуцыю, «левыя» эсэры ў змове з трацкістамі і бухарынцамі правакацыйна забілі германскага пасла ў Маскве Мірбаха і падняслі мяцеж супроць совецкай улады. На другі дзень, 7 ліпеня, Ленін тэлеграфіраваў Сталіну ў Царыцын аб падзеях у Маскве. «Мы ліквідуем, — гаварылася ў тэлеграме, — сёння-ж ноччу бязлітасна і скажам народу ўсю праўду: мы на валасок ад вайны. У нас заложнікамі сотні левых эсэраў. Усюды неабходна падавіць бязлітасна гэтых жалкіх і істэрычных авантурыстаў, стаўшых зброяй у руках контррэволюцыянераў» (стар. 202).

Адказваючы на гэту тэлеграму Леніна, Сталін пісаў: «...Што датычыць істэрычных — будзьце ўпэўнены, у нас рука не дрыгне. З ворагамі будзем дзейнічаць паварожаму» (стар. 202).

Таварыш Сталін разграміў контррэволюцыйныя арганізацыі Царыцына, забяспечыў абарону гэтага важнейшага стратэгічнага пункта на паўднёвым усходзе Расіі.

Кіруемы большэвікамі, працоўны народ вышаў пераможцам з першага этапа грамадзянскай вайны. Маладая Чырвоная Армія паспяхова біла інтэрвентаў, палаўляла контррэволюцыйныя паўстанні. Пад уплывам рэволюцыйнай агітацыі разлагаліся войскі акупантаў. Адбылася рэволюцыя ў Германіі, скінуўшая кайзера Вільгельма II і яго ўрад. Разорвал быў брэсцкі мір. К канцу 1918 года з брацкай дапамогай Совецкай Расіі аднаўляецца совецкая ўлада на Украіне, у Беларусі, Літве і Прыбалтыцы.

Але разам з тым новая грозная небяспека навісла над Совецкай краінай. Англа-французскія імперыялісты, разграміўшыя Германію, павярнулі сваю зброю супроць Совецкай краіны. З дапамогаю англа-французскага імперыялізма восенню 1918 года ў Сібіры прыйшоў да ўлады Калчак, які абвясціў сябе «вярхоўным правіцелем Расіі». Антанта пачала ўзмоцнена спабжаць і Дзенікіна.

30 лістапада 1918 года пастановай ВЦВК (за подпісамі Леніна і Свердлова) быў утворан «Совет рабочай і сялянскай абароны», быў пацверджан дэкрэт ВЦВК ад 2 верасня аб абвяшчэнні Совецкай рэспублікі «ваенным лагерам».

«Совецкая рэспубліка стаіць перад узрастаючай небяспекай утаржэння злучаных полчышчаў сусветнага імперыялізма, — гаварылася ў пастанове ВЦВК аб праіках англа-французскіх і япона-амерыканскіх інтэрвентаў. — Выступіўшы на арэну сусветнай бойні пад фальшывымі лозунгамі дэмакратыі і брацтва народаў, пабеданосныя саюзныя драпежнікі паніраюць зараз усё больш слабыя народы і дзяржавы...

У гэтых умовах сусветнага разбою, грабяжа і насілля адна краіна з'яўляецца заразаапраўдным ачагом незалежнасці рабочага класа, аплотам слабых і прыгнечаных народаў, крэпасцю соцыяльнай рэволюцыі, — гэта Совецкая Расія» (стар. 467).

Кніга канчаецца выдатнай прамовай В. І. Леніна аб першай гадавіне Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, сказанай ім 6 лістапада 1918 г. на VI усерасійскім надзвычайным з'ездзе советаў.

Апрача агульнагістарычных уводзін да раздзелаў у кнізе змяшчаецца вялікая хроніка падзей канца 1917 і 1918 года і ўказальнік крыніц. Бясспрэчна, «Дакументы па гісторыі грамадзянскай вайны ў СССР» стануць настольнай кнігай усякага, хто будзе вывучаць гэту эпоху. Выкладчыкі гісторыі СССР і асноў марксізма-ленінізма, студэнцтва, прапагандысты, кожны, хто вывучае гісторыю ВКП(б), атрымалі выдатны дапаможнік вялікай гістарычнай каштоўнасці.

І. АЗОЎСКІ.

Вынікі першай Усебеларускай канферэнцыі гісторыкаў

Па ініцыятыве Акадэміі навук БССР і Народнага Камісарыята Асветы ўпершыню сустрэліся на канферэнцыі работнікі ВНУ па гістарычных дысцыплінах, работнікі архіваў і музеязнаўцы. На працягу чатырох дзён інтэнсіўна працавалі ўдзельнікі канферэнцыі. Яны заслухалі і абмеркавалі рад важнейшых праблем па гісторыі Беларусі.

Работа канферэнцыі паказала наяўнасць у рэспубліцы значнай колькасці маладых спецыялістаў, да гэтага часу працаваўшых самастойна і не меўшых пастаяннай сувязі з Інстытутам гісторыі Акадэміі навук БССР, які, натуральна, павінен быў-бы аднаць і, разам з тым, планіраваць гістарычную навуку ў Беларусі.

Канферэнцыя паказала, што толькі агульнымі сіламі гісторыкаў, музеязнаўцаў і работнікаў архіваў можна ўзняць гістарычную навуку на належную вышыню. Будзем спадзявацца, што цяпер усе, хто займаецца вывучэннем гістарычных пытанняў, знойдуць поўнае падтрымание і дапамогу з боку Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР, які павінен будзе стаць вышэйшай навуковай установай, узначальваючай гістарычны фронт у Беларусі.

У бадзёрым настроі разыйшліся ўдзельнікі канферэнцыі, каб з новымі сіламі прыняцца за штодзённую работу, якую на іх усклалі партыя і ўрад.

На канферэнцыі з дакладамі выступалі работнікі Інстытута гісторыі і мінскіх ВНУ. На жаль, не было дакладаў работнікаў перыферыі. Гэта — буйны арганізацыйны недахоп. Наступныя канферэнцыі павінны быць так арганізаваны, каб дакладчыкам з перыферыі было адведзена належнае месца.

Другім недахопам у арганізацыі канферэнцыі была адсутнасць пэўнай тэматыкі. Прачытаныя даклады былі выпадковыя па тэматыцы. Адсюль — некаторая іх стракатасць.

У далейшым трэба наладзіць тэматычныя канферэнцыі. Абмеркаванне навукова-даследчых планаў гістарычных кафедр паказала, што не звернута дастатковая ўвага на вывучэнне нашага выдатнага совецкага перыяда. Неабходна прыступіць да хутчэйшага вывучэння нашага сацыялістычнага будаўніцтва на аснове мясцовых матэрыялаў. Разам з тым, трэба адзначыць, што часам для кандыдацкіх дысертацый намячаюцца празмерна шырокія тэмы. Так, адзін з работнікаў ВНУ выбраў для сваёй дысертацыі тэму «Стальшіншчына ў Беларусі». Тэма актуальная і патрэбная, але можна сумняваецца, каб яна магла быць распрацавана ім у адзін год. Іншая справа, калі тая-ж тэматыка намечана як доктарская дысертацыя. Загадчыку кафедры належала-б абмежаваць рамкі даследвання і гэтым даць магчымасць аспіранту сапраўды напісаць кандыдацкую дысертацыю. Інстытут гісторыі як планіруючы навуковы цэнтр павінен быў указаць кафедры на немагчымасць у кароткі тэрмін падрыхтаваць такую шырокую па тэматыцы работу.

Канферэнцыя адзначыла неабходнасць прадаўжэння раскопак у Гродне, якія маюць велізарнае навуковае значэнне для вывучэння культуры Беларусі перыяда ранняга феадалізма. Разам з тым, канферэнцыя адзначыла неабходнасць складзі падручнік па гісторыі БССР для сярэдняй школы, адсутнасць якога так моцна адчуваецца. Інстытут гісторыі павінен узяць на сябе ініцыятыву хутчэйшага яго складання.

Абмеркаванне паклада аб польскім паўстанні 1863 г. у Беларусі і аб ролі К. Каліноўскага паказала поўную нераспрацаванасць і спрэчнасць пэлага раду пытанняў. Інстытуту гісторыі трэба было-б заняцца вывучэннем гэтага першаступеннай важнасці пытання і ўнесці ў яго неабходную яснасць і па бліжэйшай канферэнцыі паставіць рад дакладаў аб 1863 годзе на Беларусі.

Удзельнікі канферэнцыі адзначылі неабходнасць хутчэйшай рэалізацыі Акадэміяй навук БССР дырэктыў партыі аб разгортванні крытыка-бібліяграфічнай работы. Яе адсутнасць адмоўна адбіваецца на выкладчыцкай і навукова-даследчай рабоце. Неабходна прыступіць да хутчэйшага падаўнення гэтага істотнага прабела на гістарычным фронце.

Адзначана таксама неабходнасць развіцця краязнаўчай навукова-даследчай работы.

Такія першыя вынікі канферэнцыі.

Не прыходзіцца сумняваецца ў тым, што ўсе пажаданні канферэнцыі будуць рэалізаваны Акадэміяй навук БССР і гэтым самым будуць створаны ўмовы для развіцця ў рэспубліцы гістарычнай марксісцка-ленінскай навукі, дастойнай нашай вялікай сталінскай эпохі.

Акадэмік В. ПІЧЭТА.



Калгас «Пуцілавец», пры якім арганізаван Цухавіцкі сортаўчастак, завяршае падрыхтоўку да вясны. На здымку: звеннявая тав. Варыончык за ачысткай зярна на трыеры.
Фото Е. Цімошчанка.

ВЯЛІКІЯ РЭЗАЛЮЦЫІ І КАРЛІКАВЫЯ ФЕРМЫ

БЫХАЎ. (Кар. «Звязды»). Загадчык Быхаўскага райземаддзела тав. Сіваргакаў паклаў на стол аб'ёмістую папку. Вялікімі літарамі на ёй значылася: «Улік пагалоўя жывёлы». Падкрэсліўшы чырвоным алоўкам процанты ў графах, ён пачынае апавядаць:

— Ну вось, парэшце, і ў нас з жывёлагадоўляй не горш, чым у людзей. Усе калгасы маюць аўпагадоўчыя фермы і фермы буйнай рагатай жывёлы. Трэба яшчэ толькі арганізаваць 6 свінагадоўчых ферм і 9 штушкагадоўчых. У бліжэйшыя 3—4 дні і гэта правярнём.

Ці адпавядаюць сапраўднасці аптымістычныя запэўненні т. Сіваргакава? Не! Коней у раёне на 569 галоў менш, чым гэта прадугледжана планам. Стада буйнай рагатай жывёлы на 585 галоў менш планавага задання.

Многія калгасы, у якіх па зводках райземаддзела лічыцца па 3 жывёлагадоўчых фермы, не займаюцца ўсур'ёз жывёлагадоўляй. Фермы існуюць толькі на паперы. Вось, напрыклад, у калгасе «XVI партз'езд», Кучынскага сельсовета, ёсць, так званая, малочна-таварная ферма, на якой налічваюцца ўсяго 4 каровы. У калгасе «17 Кастрычнік», Баркалабаўскага сельсовета, аўпаферма мае не больш, не менш, як дзве авечкі. І горш за ўсё тое, што кіраўнікі калгаса не думаюць папраўць яе.

Калгас «Луч», Кузькаўскага сельсовета, набыў двух свінаматак і неадкладна паведаміў аб арганізацыі фермы. За даволі доўгі час гэтая «ферма» павялічылася на 4 парасяці. У калгасе імені Варашылава, Клятнянскага сельсовета, на свінаферме ёсць толькі адна свінаматка і два парасяці.

Калгас «Шлях зары», Дунайкаўскага сельсовета, абзавёўся «штушкафермай», на якой лічацца 9 курэй. Не думайце толькі, што ў гэтым калгасе куры наогул не карыстаюцца павагай. Зусім не. У старшыні калгаса тав. Краўчанкі, напрыклад, іх ёсць 19 штук.

Для дотляду жывёлы на гэтых «фермах» вылучаны спецыяльныя людзі. Ім налічваюць працадні толькі за тое, што яны займаюць адпаведную пасаду.

Карлікавыя фермы, на якіх адсутнічае неабходны мінімум жывёлы, вядуць калгасы да яўных страт. Аднак работнікам райземаддзела да гэтага мала справы. Яны нагрузіліся ў лічбы і процанты. У гэтым і заключаецца іх кіраўніцтва жывёлагадоўляй.

Некаторыя кіраўнікі калгасаў, адчуваючы бескантрольнасць, пайшлі пры складанні кармавых балансаў на яўнае ашуканства. Так, у калгасе «VI з'езд Советаў», Клятнянскага сельсовета, па зводках, з кармамі ўсё ў парадку. На самай справе для грамадскай жывёлы тут вылелена ўсяго толькі 844 цнт. сена замест 1.250 цнт. па балансу. У калгасе «17 Кастрычнік», Баркалабаўскага сельсовета, засыпана толькі 62 цнт. канцэнтратаў замест 120 цнт. па балансу. У калгасе «Прагрэс», Новабыхаўскага сельсовета, асабістая жывёла калгаснікаў атрымала кармоў у тры разы больш чым грамадская.

Ва многіх калгасах кармы растрапжрыруюцца, раздаюцца без меры і вагі. У калгасе «Рассвет», Чырвона-Слабодскага сельсовета, на стойлавы перыяд было вылелена 120 цнт. канцэнтратаў і 3.000 цнт. саломы і мяхіны. У выніку бескантрольнага расходвання кармоў тут па 1 студзеня асталося толькі 37 цнт. канцэнтратаў і 832 цнт. мяхіны і саломы. Бачачы, што ферма астаецца без кармоў, праўленне калгаса пайшло на разбазарванне пагалоўя грамадскай жывёлы. Са свінафермы, якая не была ўкамплектавана, прадалі 32 парасят.

У раёне не клапоцяцца аб стварэнні пастаянных жывёлагадоўчых кадраў на фермах. Для жывёлаводаў не арганізуюцца курсы, ніхто іх не вучыць і на практычнай рабоце. Усё гэта сазрэйнічае цікучасці кадраў. У калгасе «Большэвік», Ніжнетопчыцкага сельсовета, за год змяніліся тры загадчыкі ферм. Такіх прыкладаў можна прывесці многа.

Адсутнасць на фермах пастаянных кадраў, людзей, якія любяць сваю справу, прывяла да вялікага адыходу маладняка і падзяжа рознай жывёлы. У адным толькі калгасе «Чырвоны сцяг», Трылесінскага сельсовета, пала 33 кані. У калгасе «Зара», Кузькаўскага сельсовета, было 8 выпадкаў траўматычных пашкоджанняў коней. У калгасах «Новае жыццё» і «VI з'езд Советаў», Клятнянскага сельсовета, «Маяк комуны», Глухскага сельсовета, былі выпадкі абартавання конематак.

У раёне ёсць 3 зоаветэрынарных участкі і 5 зоаветэрынарных пунктаў. Здаецца, чаго жадаць лепшага! Аднак раённае кіраўніцтва не паклапаціцца забяспечыць участкі спецыялістамі. Два участкі зусім не маюць ветурачоў. Не поўнасцю ўкамплектаваны спецыялістамі і зоаветэрынарныя пункты. У самым апарасе райземаддзела наглядаецца цякучасць спецыялістаў. За год на пасадзе зоатэхніка па кані пабывала 4 чалавекі. Старшы зоатэхнік тав. Арэхаўскі працуе толькі адзін тыдзень. Вядома, што пры такім становішчы калгасам цяжка атрымаць кіраўніцтва з боку райземаддзела.

Папрабуйце папражнуць старшыню райвыканкома тав. Рэйнгольда, або сакратара райкома партыі тав. Бурдзілава, што яны не займаюцца справай жывёлагадоўлі, — вы сустрэнеце адпор. Вам скажуць:

— Вось пастанова аб укамплектаванні ферм, а вось рэзалюцыя аб далейшанні пароднасці жывёлы.

Бясспрэчна, раённыя арганізацыі вынеслі нямала добрых пастаноў і рэзалюцый, але паранейшаму застаюцца карлікавыя фермы ў калгасах, абыякавыя адносіны да важнейшай дзяржаўнай справы.

Т. ЗОМАЎ.

Ленінскія агні

Праязджаючы ўначы дарогамі Аршанскага, Шклоўскага і сумежных з імі раёнаў, мімаволі любуешся не зусім звычайным малюнкам. То там, то сям на сінеючым небасхіле ўспыхвае лёгкае зарава, запяміяючы сабой густыя зімовыя зоры. Калі-ж з лагчын і пералескаў дарога выбіваецца на шырокую раўніну — у далечыні з некалькіх бакоў раптам узнікаюць яркія гірлянды прыветлівых, вабячых да сябе аганькоў.

Спачатку думаеш, што едзеш аснежаным полем блізка ад буйных гарадоў, і гэта над імі ўспыхваюць электраагні, ажыўляючы і ўпрыгожваючы краявід. Аднак, паказваючы на гірлянды аганькоў, калгаснік-возчык упамінае знаёмыя беларускія назвы вёсак: Стайкі, Стараселле, Свішчы. Аказваецца, адсюль да бліжэйшага горада — дзесяткі кілометраў.

— Бачыце, і глуш не глуш, — здаволена заўважае калгаснік, падганяючы каня. — Нават цяплей становіцца ад гэтых аганькоў...

Сямён Сілашны з калгаса «Энергія» на Шклоўшчыне — старык. Яму за шэсцьдзесят год. У гэтых мясцінах ён да дробязей ведае кожную лагчыну, кожны ўзгорак, кожны пералесак. Тысячы раз мерыў ён іх уласнымі нагамі. Але праязджаючы цяпер тут, ён таксама любуецца начным краявідам, упрыгожаным аганькамі. Ён рад падзяліцца сваімі думкамі, успамінамі і пачуццямі, навеяными гэтым малюнкам.

— Эге, — кажа ён. — Толькі за апошні дзесятак год на маіх вачах адбыліся такія змены, пра якія я і думаць не думаў і гадаць не гадаў. Зніклі назаўсёды межы, дружней і весялей зажылі мы. Трактары, камбайны прышлі на поле. Дык мала гэтага. Паявіліся людзі з горада, працягнулі на палях за многа вёрст правады, і глядзі — у сялянскай хаце ўспыхнула электрычнасць.

— Ну, як не дзівіцца і не радавацца тут! — усклікае дзед. — Надыйдзе, скажам, такі студзеньскі вечар, завіруха і сцюжа за акном, а ты павернеш выключацель на сцяне, і хата азалоціцца такім святлом, ад якога адразу на сэрцы пацяплее, і неяк нават сорамна ўспомніць лучыну ды газнічку, што калісь калцілі і столь і сцены. Або пойдзеш у гэтую ноч на канюшню — і тут светла. Хоць іголкі ў сене шукай...

— Вялікая справа, гэтая лямпачка Ільіча,—крыху памаўчаўшы, у задуменні дадае дзед. — Праз'аў народ так электрычнасць і, напэўна, не дарма праз'аў. Бачуць, нябожчык Ленін у Крэмлі рашыў калісь, каб гэта лямпачка асвятляла шлях-дарогу кожнаму, хто ўласным мазалём здабывае хлеб, каб аблягчала яна працу яго, каб несла яна яму і святло, і цеплыню, і радасць. Ну дык вось, напэўна, за гэта і праз'аў яе так народ...

Ва ўяўленні дзеда электрычнасць звязана з прыгожай легендай, у якую ператварае народ, выражаючы сваю любоў да вобраза Ільіча, многія факты з яго жыцця і дзейнасці.

Магчыма, што дзед Сямён, як і многія яго аднагодкі, для якіх сёнешняя рэчаіснасць нагадвае цудоўны сон, і не здагадваецца, што ўяўляемая ім легенда ёсць сапраўдная быль, што якраз тое, аб чым ён апавядае, было адным з гарачых і страсных летуценняў Ільіча.

У цяжкія годы разрухі і грамадзянскай вайны вялікі правадыр рэволюцыі ўжо ўяўляў сабе будучыню краіны, як эпоху высокай тэхнікі, створанай на базе электрычнасці. Хмары вайны паўставалі на небасхіле. Разбуранымі, абязлюдзенымі прасцягамі ляжала краіна. Без святла, без паліва чарнелі гарады. А Владзімір Ільіч будаваў план, які павінен быў ператварыць дробнасялянскую краіну ў тэхнічна аснашчоную, электрыфікаваную, сацыялістычную дзяржаву.

«Крэмлёўскі лятуценнік» — назваў тады Владзіміра Ільіча вядомы англійскі пісьменнік Герберт Уэллс. Як і многім іншым, яму здавалася фантастыкай перавесці адсталую, раздробленую краіну на рэльсы буйнай вытворчасці. Для гэтага, на яго думку, патрэбны былі стагоддзі, а не 10—15 год, як прапаноўваў Ленін і як падтрымлівала яго ў гэтым створаная ім вялікая партыя большэвікоў і яго бліжэйшы баявы саратнік таварыш Сталін.

Партыя і народ пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна ажыццявілі ідэю Ільіча. Неўзабаве загарэліся агні Шатурскай электрастанцыі пад Масквой. Загрымелі турбіны Волхаўскай гідраэлектрастанцыі. Шалёнае парожыстае русло Дняпра перагарадзіла плаціна ля Запарожжа, і ад вырасшай тут магутнай электрастанцыі на сотні кілометраў пабеглі правады па стэпавых прасторах Украіны.

Ленінская ідэя дасягнула і абшараў Беларусі — не так даўно яшчэ занядбанай, цёмнай і забітай акраіны царскай Расіі. Лучына і смольны корч асвятлялі калісь тут сялянскую хаціну.

У 1930 годзе пушчана самая вялікая па Беларусі электрастанцыя на Асінаўскім балотным масіве, пад Оршай. Яна дала энергію прадпрыемствам Віцебска, Магілева, Оршы і калгасам шматлікіх раёнаў, размешчаных на многія дзесяткі кілометраў ад яе. З пускам Асінаўскай і многіх іншых, больш дробных электрастанцый, магутнасць іх у 20 разоў перавысіла магутнасць электрастанцый Беларусі ў 1913 г.

Мясціны, апаясаныя правадамі Асінаўскай электрастанцыі, якраз і выклікаюць цяпер захапленне старога калгасніка са Шклоўшчыны, з якім мы едзем на чыгуначную станцыю гэтай зімовай ноччу, асветленай ласкавымі электраагнямі. Сямён Сілашны расказвае пра калгас, пра свае буднія клопаты, але зноўтакі звяртаецца да толькі-што абарванай тэмы, навеянай уражаннямі гэтай начной паездкі.

— Ну вось, — кажа ён, — восенню мы, скажам, узяліся малаціць. Паставілі на таку складаную малатарню з МТС. Гэта-ж жарты, колькі спатрэбілася-б коней, каб павярнуць яе. Што-ж датычыць трактара, дык яго месца, калі разумна судзіць, на полі. А тут проста — прышоў мацнёр, правёў правады з буднкі да машыны, уключыў рубільнік, і малатарня затарахцела на славу. Ну, а млын, а лесапілка, а саломарэзка,—іх-жа таксама электрычнасць рухае...

Дзед замоўк на хвіліну, выняў з кішэні кісет, закруціў цыгарку і, прыпаліўшы яе, як-бы падагуліў:

— Вось я і кажу... Вялікая хаваецца сіла ў гэтых агнях. Не дарэмна ў той год, калі правялі да нас электрычнасць, з навакольных хутароў пасыпаліся заявы ў калгас. Людзі ўбачылі, што значыць калектыў, што можа зрабіць ён, ды тым больш, калі ёсць машыны, калі і хата, і двор, і ўся вёска заліты святлом.

Мы пад'ехалі да станцыі. У праэрыстай сіні ночы ўзніклі абрысы водапорнай вежы, станцыйных будынкаў. У далечы-ж, па-ранейшаму, успыхвалі, прыветліва мільгаючы, электраагнікі калгасных вёсак, раскінутых між палёў, пералескаў і узгоркаў, і прыемна было думаць, што гэтымі аганькамі зяе наша шчаслівае сёння, у якім увасоблены неўміраючыя ідэі Ільіча.

Тар. ХАДКЕВІЧ.

АРГАНІЗАЦЫЯ МАСАВАЙ АГРАЗОАТЭХВУЧОБЫ

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону). Барацьба за атрымание стоцудовага ўраджаю з гектара і павышэнне прадуктыўнасці жывёлы неразрыўна звязаны з арганізацыяй масавай агразоатэхнічай вучобы калгаснікаў і ўсяго калгаснага актыва.

Істотным недахопам агратэхвучобы мінулага года з'яўлялася тое, што на заняткох мала вывучаўся вопыт перадавікоў сельскай гаспадаркі — удзельнікаў Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Райком партыі і райвыканком з удзелам спецыялістаў райза распрацавалі новы план агратэхвучобы на 1941 год. Вучоба пачалася з 15 снежня і працягнецца да 15 мая. Заняткі праводзяцца два разы ў месяц. Усяго будзе прачытана звыш 40 лекцый і дакладаў, у тым ліку лекцыі перадавікоў сельскай гаспадаркі раёна, удзельнікаў выстаўкі.

Так, напрыклад, актывісты калгаса «Маяк сацыялізма» прачытаюць на заняткох лекцыю аб правілах унутранага распарадку ў калгасе. Звеннявы па кукурузе з калгаса «Дружная праца» тав. Малчанін прачытае лекцыю аб вопыце барацьбы за атрыманне высокіх урэджаяў кукурузы. Брыгадзір калгаса «Большэвік» тав. Качан прачытае лекцыю аб тым, як яго брыгада атрымала па 350 цнт. бульбы з гектара. Будуць таксама прачытаны лекцыі ўдзельнікаў выстаўкі аб заваяванні высокіх паказальнікаў па жывёлагадоўлі, гародніцтву, пчалярству і т. д.

Вучоба ў раёне арганізавана наступным парадкам. Пры ўсіх трох МТС створаны курсы для старшынь сельсоветаў, сакратароў пярвічных партыйных арганізацый і старшынь калгасаў. Усяго на курсы прынята 20 старшынь сельсоветаў, 22 сакратары пярвічных партарганізацый і 120 старшынь калгасаў.

Пачынаючы з 16 снежня, на курсах вывучаны наступныя тэмы: «Задача далейшага развіцця сацыялістычнай сельскай гаспадаркі»; «Звеннявая арганізацыя працы ў калгасе»; «Утрыманне і догляд жывёлы зімой»; «Ефрэмаўскія метады падрыхтоўкі насення да сяўбы і арганізацыя насенных участкаў»; «Як атрымаць 2500 — 3000 літраў малака за год ад кожнай фуражнай каровы, 20 парасят ад свінаматкі і 150 ягнят ад 100 аўцаматак». Лекцыі чыталі старшыня выканкома райсавета, сакратар райкома партыі, галоўны аграном райза, аграномы і зоатэхнікі раёна. Заняткі праходзяць ажыўлёна, слухачы задаюць мнота пытанняў па прачытаных лекцыях.

Для брыгадзіраў, загадчыкаў ферм і звеннявых створаны 21 вучэбны пункт пры сельсоветах. На гэтых пунктах навучаецца: брыгадзіраў паляводчых брыгад 254, загадчыкаў фермамі 275, звеннявых 450 чал. Праведзены ўжо 4 заняткі, на якіх прачытаны наступныя лекцыі: «Статут сельгасарцелі»; «Будова і жыццё раслін»; «Глеба і яе апрацоўка»; «Угнаенні». Заняткі праводзяць спецыялісты райземаддзела, аграномы, зоатэхнікі, ветурачы.

Па рашэнню РК КП(б)Б і райвыканкома, у раёне павінен быць арганізаван агразоатэхкабінет. Ала райземаддзел праяўляе выключную непаваротлівасць і зрывае яго арганізацыю.

А. ДЖЭЛЮК.

КУЛЬТУРА ПІНСКАГА СЯЛА

ПІНСК. (Кар. «Звязды»). У часе гаспадарання польскіх паноў на Піншчыне апрача каспёлаў, цэркваў і пастарункаў амаль нічога не будавалася. Гэта быў адзін з адстаючых краёў панскай Польшчы.

Зараз Піншчына мяняе сваё аблічча. У мястэчках і сёлах будуюцца клубы, ствараюцца новыя школы, хаты-чытальні, кінотэатры. За апошні час у Ганцэвіцкім раёне пачалі працаваць 10 новых хат-чыталень. У самім раённым цэнтры днямі адкрыт новы кінотэатр на 400 месц. У вёсцы Хомск, Драгічынскага раёна, арганізаваны нямоўная сярэдняя і вячэрняя школы, хата-чытальня, пабудаван клуб.

Новыя кінотэатры ў гэтым годзе будуць адкрыты ў вёсках В. Чучэвічы, Лахва і мястэчку Кажан-Гарадок, Лунінецкага раёна.

Усяго ў абласці ў 1941 годзе будзе абсталяван 21 кінотэатр. Для іх у абласное ўпраўленне кінофікацыі ўжо прыбыла першая партыя кіноапаратуры.

ТОРФАВІВІЯНІТЫ—КАШТОЎНАЕ ЎГНАЕННЕ

У пастанове СНК БССР і ЦК КП(б)Б «Аб мерапрыемствах па накапленню і правільнаму скарыстанню ўгнаенняў у калгасах і соўгасах БССР» запісана: «Улічваючы значныя запасы торфавівіянітаў і іх вялікае значэнне, як угнаення — устанавіць план здабычы і ўнясення ў глебу торфавівіянітаў у размеры 100 тыс. тон».

Торфавівіяніты ў гэтым годзе павінны знайсці самае шырокае прымяненне на палях калгасаў і соўгасаў нашай рэспублікі.

Торфавівіяніт — новы від мясцовага фосфарнага ўгнаення, залежы якога вылены ў многіх месцах на тэрыторыі БССР, пераважна ў нізінных тарфяных балотах.

Залежы вівіяніта ў торфе бываюць у выглядзе пластоў большай ці меншай магутнасці, даходзячых часам да 1 і больш метраў таўшчыні, або ў выглядзе невялікіх праслоек, гнёзд, утвараючы разам з торфам як-бы «камбінаванае» торфа-фасфатнае ўгнаенне.

Сыры, неправетраны торфавівіяніт, які знаходзіцца пад пластом пераласычанага валой торфу, прадстаўляе сабой зямлістую мажучуюся масу шэравата-белага колеру, якая мае каля 60 проц. вады. Калі торфавівіяніт выкідваецца на паверхню балота, ён пачынае акісляцца і змяняе сваю афарбоўку на блакітна-сінюю, якая з'яўляецца характэрнай знешняй адзнакай для балотнага торфавівіяніта.

Сухі торфавівіяніт прадстаўляе сабою дробны парашок, падобны на сінюю фарбу, які пранізан непарапрэўшымі астаткамі раслінай масы торфу.

Фосфарнай кіслаты ў торфавівіяніце бывае ад 20 і больш процантаў, у залежнасці ад магутнасці залягаемага пласта торфавівіяніта і знаходзячыхся ў ім прымесей, галоўным чынам торфу.

Праветрыванне торфавівіяніта мае вельмі вялікае значэнне для яго ўгнойваючага дзеяння. Спецыяльна праведзенымі Інстытутам сацыялістычнай сельскай гаспадаркі Акадэміі навук БССР доследамі ўстаноўлена, што пры ўнясенні ў глебу неправетранага торфавівіяніта, фосфарная кіслата яго з'яўляецца неўсвояемай для раслін, у той час, як унесены ў глебу праветраны, сухі торфавівіяніт з'яўляецца добрай крыніцай фосфарнай кіслаты для сельскагаспадарчых раслін.

Так, напрыклад, у калгасе імені Варашылава, Церахоўскага раёна, пры ўнясенні ў папар праветранага торфавівіяніта з разліку 180 кг фосфарнай кіслаты на гектар (на слаба падзолістым і пясчаным суглінку) атрыман ураджай азімага жыта 21,6 цнт. з гектара, пры ўраджаі па кантрольным участку 15,9 цнт. Прыбаўка ўраджаю ад торфавівіяніта выразілася, такім чынам, у 5,7 цнт. зярна з гектара.

Торфавівіяніт добра дзейнічае і на яравыя культуры. У калгасе «9-е студзеня», Мінскага раёна, ранняй вясной пад ячмень быў унесен торфавівіяніт з разліку 180 кг. фосфарнай кіслаты на гектар. Ён уносіўся пад пераворванне зябліва. Глеба— цяжкі суглінак. Ураджай атрымаўся 21,4 цнт. з гектара, пры ўраджаі на кантрольным участку ў 17 цнт. Прыбаўка ўраджаю ад торфавівіяніта склала 4,4 цнт. зярна. У тым-жа калгасе торфавівіяніт выпрабоўваўся і пад авёс. Рэзультаты такія: ураджай па торфавівіяніту 20,9 цнт. зярна, пры ўраджаі на кантрольным участку 17,0 цнт. з гектара. Прыбаўка ўраджаю за кошт торфавівіяніта—3,9 цнт. зярна з гектара.

Пры ўнясенні торфавівіяніта пад бульбу на слаба падзолістым, пылаватым суглінку ў калгасе імені Варашылава, Церахоўскага раёна, прыбаўка ўраджаю бульбы склала 40 цнт. клубняў з гектара.

Даволі моцнае ўздзеянне торфавівіяніта праяўляецца і на ўраджаі ільну. Унесены торфавівіяніт з разліку 90 кг фосфарнай кіслаты на гектар пад лён на падзолістым, пылаватым суглінку ў калгасе «Звязда», Мінскага раёна, павысіў ураджай ільну на 5,7 цнт. ільносаломкі і на 2,1 цнт. ільносемя.

Аднак трэба мець на ўвазе, што дзеянне торфавівіяніта на розных глебах праяўляецца неадналькава. Пры параўнанні дзеяння торфавівіяніта з іншымі ўгнаеннямі — з фасфарытнай мукой і суперфасфатам на розных глебах было ўстаноўлена, што на слаба кіслых глебах і на глебах, на якіх папярэдне ўносілася вапна, дзеянне торфавівіяніта праяўлялася мацней, чым дзеянне фасфарытнай мукі. На такіх глебах торфавівіяніт амаль не ўступаў дзеянню суперфасфата. На глебах-жа моцна кіслых фасфарытная мука дзейнічала мацней торфавівіяніта. Залішняя кіслотнасць глебы садзейнічае разлажэнню фасфарытнай мукі і пераводзіць у больш даступнае становішча фосфарную кіслату для раслін, у той час як для торфавівіяніта кіслотнасць глебы не адыгрывае такой ролі. Наадварот, моцная кіслотнасць глебы не садзейнічае разлажэнню торфавівіяніта. Таму на моцна кіслых глебах лепш уносіць фосфарную муку, а на менш кіслых і завапнаваных — торфавівіяніт.

Для павышэння дзеяння торфавівіяніта, асабліва на кіслых глебах, вельмі добрым прыёмам з'яўляецца ўнясенне торфавівіяніта ў выглядзе сумесі з фасфарытнай мукой. Сумесь пажадана прыгатаўляць дзён за 10 — 15 да ўнясення ў глебу. Прычым калі торфавівіяніт знаходзіцца ў стане сухога, пылаватага парашку, то яго трэба змачыць невялікай колькасцю вады, каб ён не пыліў. Але ў той-жа час не трэба пераліваць і лішняй вады, каб ён не ператвараўся ў кашападобны стан. Пры такім стане ён будзе дрэнна перамешвацца з фасфарытнай мукой, і сумесь цяжка будзе раўнамерна рассеяць па паверхні пахаці.

Пры ўзаемадзеянні торфавівіяніта з фасфарытнай мукой у сумесі атрымліваецца значна большая колькасць засвояемай для раслін фосфарнай кіслаты, і дзеянне сумесі на ўраджай раслін праяўляецца значна мацней, чым дзеянне асобна ўнесеных фасфарытнай мукі або торфавівіяніта.

Суадносіны торфавівіяніта да фасфарытнай мукі могуць быць 1:1 па разліку на колькасць у іх фосфарнай кіслаты, а для моцна кіслых глеб можна браць на адну частку торфавівіяніта 2—3 часткі фасфарытнай мукі. Унясенне ў глебу сумесі торфавівіяніта з фасфарытнай мукой неабходна праводзіць пад плуг або пад культыватар. Аднак не трэба праводзіць мелкай заделкі, г. зн. уносіць пад барану, калі пасля баранавання поле не пераворваецца да пасеву культуры.

Вялікае значэнне для атрымання добрага эфекта ад торфавівіяніта, як і ад іншых мінеральных фосфарных угнаенняў, з'яўляецца запраўка глебы азотнымі мінеральнымі ўгнаеннямі або арганічнымі ўгнаеннямі (гной, торф, зялёнае ўгнаенне), якія з'яўляюцца таксама крыніцамі азота.

Справа ў тым, што ў большасці падзолістых глеб расліны адчуваюць недахоп не толькі ў фосфарнай кіслаце, але і ў азоце, а пры недахопе засваяемага азота вельмі зніжаецца дзеянне фосфарных угнаенняў, у тым ліку і дзеянне торфавівіяніта. Таксама атрымліваецца заніжаны эфект ад азотных угнаенняў, калі не хапае ў глебе фосфарнай кіслаты. Таму неабходна побач з рацыянальным скарыстаннем мінеральных азотных угнаенняў, максімальна скарыстаць усе віды арганічных угнаенняў — гной, торф, зялёнае ўгнаенне і т. д.

Улічваючы наяўнасць велізарных тарфяных запасаў на тэрыторыі БССР, неабходна ўсяляк паспрыяць здабычы торфу на ўгнаенне. Вельмі добры рэзультат атрымліваецца пры ўнясенні торфу сумесна з торфавівіянітам, або пры ўнясенні так званых вівіянітавых торфаў, у якіх вівіяніт знаходзіцца ў выглядзе невялікіх праслоек або гнёзд. Такіх торфаў сустракаецца вельмі многа ў нізінных тарфяных балотах. Пры тарфаванні глебы вівіянітавыя торфы неабходна скарыстаць у першую чаргу. Пры параўнанні дзеяння вівіянітавага торфу і торфу звычайнага, унесеных пад бульбу ў калгасе імені Варашылава, Церахоўскага раёна, у колькасці па 40 тон на гектар, выявілася, што прыбаўка ўраджаю па вівіянітаваму торфу склала 40,5 цнт. з гектара, а па торфу звычайнаму — 24,7 цнт. — амаль у два разы менш.

Вівіянітавы торф з'яўляецца вельмі добрым матэрыялам і для кампастыравання яго з гноем. У такім кампосце атрымліваюцца добрыя суадносіны фосфарнай кіслаты да іншых пажыўных элементаў. Пры прыгатаванні кампоста зімою быў узят вівіянітавы торф, у суадносінах да гною 1:1, і вясной кампост быў унесен пад ячмень у колькасці 40 тон на гектар. Ураджай ячменю атрымаўся 33,3 цнт. зярна з гектара пры ўраджаі на кантрольным участку 26,8 цнт. Такім чынам, торфавівіяніта-гнойны кампост, у першы год даў прыбаўку ўраджаю 6,5 цнт. зярна з гектара. А трэба сказаць, што дзеянне такога кампоста не абмяжоўваецца адным годам, ён дзейнічае і на наступныя культуры севазавароту.

Торфавівіяніт залягае ў нізінных тарфяных балотах, неглыбока ад паверхні, часта на глыбіні 20—30 см. і рэдка глыбей аднаго метра. Таму здабыча торфавівіяніта не прадстаўляе цяжкасцей, асабліва калі балота асушана.

На асушаным балоце некалькі год назад (калі торфавівіяніт залягае неглыбока ад паверхні, г. зн. вышэй стаяння вады ў балоце) торфавівіяніт падвяргаецца акісленню па месцы свайго залягання. Самы верхні слой торфавівіяніта пасля працяжнага акіслення ператвараецца спачатку ў сіні вівіяніт, а потым у бераўніт, прадстаўляючы сабою жаўтавата-белага колеру дробную крупчатую масу. Бераўніт таксама можна скарыстаць на ўгнаенне. Яго дзеянне некалькі слабей, чым дзеянне торфавівіяніта, але калі яго ўносіць разам з торфам, то ён дае значныя прыбаўкі ўраджаю і ў поўнай меры сябе апраўдвае.

Здабыча торфавівіяніта можа быць рознай, у залежнасці ад характару яго залягання. Калі торфавівіяніт залягае параўнальна вялікімі праслойкамі таўшчынёю ў 30—40 см. і больш, яго можна здабываць у чыстым выглядзе, знёўшы папярэдне верхні слой торфу. Калі-ж торфавівіяніт залягае невялікімі праслойкамі або асобнымі ўкрапленнямі, то здабываць яго можна, таксама як і торф, па паліва.

Замельныя органы, кіраўнікі калгасаў і соўгасаў павінны ўдзяліць самую сур'ёзную ўвагу здабычы і прымяненню торфавівіяніта на ўгнаенне.

В. С. РУБАНАЎ,
кандыдат сельскагаспадарчых навук інстытута сацыялістычнай сельскай гаспадаркі Акадэміі навук БССР.

ЗА РУБЯЖОМ

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 6 лютага. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае з Каіра камунікэ камандавання англійскіх паветраных сіл на Бліжнім Усходзе: англійская авіяцыя зноў зрабіла налёты па Барку, Бэрку, Беніну (Лівія). У раёне паміж Марауа і Барку наша авіяцыя падвергла інтэнсіўнай бамбардыроўцы мотатранспарт праціўніка, нанёсшы яму значныя пашкоджанні. У час налёту на чыгуначную станцыю Барку адзначаны тры прамыя попаданні бомб у чыгуначнае палатно. Бомбы былі скінуты таксама на ангары ў Бэрку.

Англійскія знішчальнікі ў час патрульных палётаў збілі два італьянскія самалёты. Апусціўшаяся ў Тольмеце (Лівія) непрыяцельская лятаючая лодка падверглася бамбардыроўцы і была знішчана. Знішчан таксама італьянскі бамбардыроўшчык у Апалоніі.

Англійскія бамбардыроўшчыкі зрабілі некалькі налётаў на ваенныя аб'екты ў Эрытрэі. Паветранай атацы падвергся непрыяцельскі мотатранспарт паміж Асмарай і Керэнам.

4 лютага непрыяцельская авіяцыя зрабіла налёт па Мальту. Англійскія знішчальнікі ўступілі ў бой з самалётамі праціўніка. Па меншай меры тры італьянскія самалёты былі збіты і некалькі пашкоджана. Бамбардыроўка нанесла нязначныя страты.

Пасля ўсіх аперацый на фронтах у Афрыцы англійскія самалёты, за выключэннем аднаго бамбардыроўшчыка і аднаго знішчальніка, вярнуліся на свае базы.

Паветраны бой над Ла-Маншам

ЛОНДАН, 5 лютага. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае, што днём 5 лютага ля паўднёва-ўсходняга ўзбярэжжа Англіі адбыўся паветраны бой паміж англійскімі і германскімі самалётамі. Германскія самалёты прабавалі атакаваць караван англійскіх суднаў у Ла-Маншы, але ў сваю чаргу падверглися нападу англійскіх самалётаў. У выніку паветранага бою 3 германскія бамбардыроўшчыкі былі збіты.

БЕРЛІН, 5 лютага. (ТАСС). Як перадае Германскае інфармацыйнае бюро, сёння пад абаронай амаль суцэльнай воблачнасці англійскія самалёты прабавалі зрабіць налёт на ўзбярэжжа Ла-Манша. Аднак гэтая спроба не ўдалася. Германскія знішчальнікі рассеялі злучэнні англійскіх бамбардыроўшчыкаў і, згодна да гэтага часу маючыхся вестак, збілі 14 англійскіх самалётаў, прымусіўшы астатнія павярнуць назад раней, чым яны дасягнулі сваіх мэт.

„Ньюс кронікл" аб падрыхтоўцы германскага ўтаржэння ў Англію

ЛОНДАН, 5 лютага. (ТАСС). Карэспандэнт газеты «Ньюс кронікл», спасылаючыся на добра інфармаваныя кругі, паведамляе з Лісабона, што асноўным раёнам, дзе праводзіцца падрыхтоўка германскіх войск, прызначаемых для ўтаржэння ў Англію, з'яўляецца французскае ўзбярэжжа ад Брэста да Ангэя. Апрача таго, падрыхтоўка вядзецца таксама ў Нарвегіі і, магчыма, на паўночным узбярэжжы Галандыі і Даніі.

Французскае ўзбярэжжа падзелена на асобныя раёны, у якіх ёсць усе ўмовы для падрыхтоўкі войск да дзеянняў на сушы, а таксама для высадкі на ўзбярэжжа. Кожнае злучэнне, прызначаемае для ўтаржэння, праходзіць марскую падрыхтоўку незалежна ад другіх злучэнняў. Падобная сістэма падрыхтоўкі дае магчымасць расканцэнтраваць абучаемыя войскі і базы, з якіх павінна быць прадпринята ўтаржэнне ў Англію, з тым, каб гэтая падрыхтоўка захоўвалася ў сакрэце.

Буйныя баржы скарыстоўваюцца для перавозкі танкаў і ўкрыты на спецыяльных базах, дзе і праводзіцца падрыхтоўка танкістаў і тэхнічнага персанала. Судны меншых размераў скарыстоўваюцца для абучэння пяхоты. Воінскія часці, прызначаемыя для ўтаржэння, будуць пасаджаны на судны і невялікія баржы. Войскі, пагружаныя на гэтыя судны, накіроўваюцца ўздоўж узбярэжжа і высаджваюцца ў іншым пункце, адкуль яны вяртаюцца ў свой лагер, выконваючы па дарозе розныя заданні.

Да становішча ў Румыніі

БУХАРЭСТ, 6 лютага. (ТАСС). Газеты прадаўжаюць публікаваць афіцыяльныя паведамленні аб рэзультатах арыштаў і вобыскаў, праведзеных ўладамі з мэтай выяўлення віноўных у падзеях 21—23 студзеня. Паводле гэтых паведамленняў, у мяцежнікаў канфіскавана зброя. У Бухарэсце і правінцыі былі знойдзены новыя склады з маёмасцю.

У паведамленнях гаворыцца, што 4 лютага ваенны суд прыгаварыў 31 чал. з ліку паўстаўшых легіянераў да турэмнага зняволення ад 3 месяцаў да 5 год.

У Бухарэсце ўводзіцца дзённае і начное патруліраванне вуліц спецыяльнымі грузавікамі. Мэта патруліравання — кантроль за захоўваннем насельніцтвам выданых абавязковых пастаноў. Патруль будзе арыштоўваць асоб, якія не выконваюць гэтых пастаноў.

Заява прадстаўніка бельгійскага пасольства ў ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 6 лютага. (ТАСС). Паводле паведамлення газеты «Нью-Йорк таймс», прадстаўнік бельгійскага пасольства ў ЗША заявіў, што ў Бельгійскім Конга сфарміравана бельгійская армія ў саставе 90 тысяч чалавек. З гэтага ліку некалькі дывізій паслана ў Кенію для сумесных дзеянняў з англійскімі войскамі. Бельгійскае пасольства закупляе ў ЗША ваенныя матэрыялы на золата, якое належыць Бельгійскаму Конга.

ПАВОДКА У ВЕНГРЫІ

БУДАПЕШТ, 5 лютага. (ТАСС). Газеты паведамляюць, што ў некаторых раёнах Венгрыі паводка прыняла катастрафічныя размеры. Воды Дуная прарвалі дамбы ў непасрэднай блізасці ад Будапешта. Паблізу ад Будапешта лёд узрываюць бомбамі, скідваемымі з самалёта.

Пасяджэнне венгерскага парламента

БУДАПЕШТ, 5 лютага. (ТАСС). Газеат «Мадзьяршаг» паведамляе, што на вячэрнім пасяджэнні палаты дэпутатаў венгерскага парламента ад імені «партыі венгерскага абнаўлення» выступіў па пытанню аб бараньбе з паводкай дэпутат Райніш. Райніш абвінавачваў урад у тым, што ён не прыняў неабходных мер для абароны Алфэлда (венгерская нізіна—далі-на Дуная, на поўдзень ад Будапешта) ад паводкі і што памылкі ў гэтых адносінах дапускаліся на працягу дзесяцігоддзяў. Райніш заявіў, што Алфэлд ператварыўся зараз у мора, дзе знаходзяцца пад вадой 500 тысяч іох зямлі (іох — 0,575 гектара). Поўмільёна чалавек пазбаўлены прытулку і крыніц існавання.

Вайна ў Еўропе і Афрыцы

(Дзённік ваенных дзеянняў, 6 лютага 1941 года)

Англійскія войскі, якія аперыруюць у Паўночнай Афрыцы, прадаўжаюць, паводле паведамлення англійскага радыё, прасоўвацца ў напрамку на Бенгазі.

Асабліва вялікую актыўнасць праяўляе авіяцыя. Італьянскія самалёты, гаворыцца ў зводцы італьянскага камандавання, абстралялі з кулямётаў і падверглі бамбардыроўцы англійскія мотамеханізаваныя часці. Англійская авіяцыя, паведамляе камунікэ камандавання англійскіх паветраных сіл на Бліжнім Усходзе, зноў падвергла інтэнсіўнай бамбардыроўцы чыгуначную станцыю Барка, лінію камунікацый, злучаючую Барку з Бенгазі, а таксама Беніну і аэрадромы ў Берке.

У Італьянскай Усходняй Афрыцы, на паўночным фронце ў зоне Керэна (Эрытрэя), гаворыцца ў італьянскай зводцы, 5 лютага ішлі моцныя баі.

Англійскія войскі, якія рухаюцца ў паўночным напрамку, паведамляе з Хартума карэспандэнт агенцтва Рэйтэр, пачынаюць акружаць Керэн.

Італьянцы адступаюць на ўсіх трох франтах Усходняй Афрыкі.

У Абісініі мотамеханізаваныя часці англічан рухаюцца да Гандара.

Італьянская і англійская зводкі адзначаюць актыўнасць авіяцыі абодвух старон на ўсіх гэтых франтах.

Вярхоўнае камандаванне грэчаскай арміі паведамляе ад актыўных дзеянняў асобных патрулей і інтэнсіўных дзеянняў артылерыі. Грэчаскія войскі адбілі танкавую атаку італьянцаў.

На цэнтральным фронце грэкі ўзялі штурмам важны стратэгічны пункт. Грэчаскія войскі, як паведамляе карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс, прасоўваюцца к Валоне і Берату.

У прыбярэжным сектары грэчаскія войскі адбілі дзве контратакі італьянцаў. Агенцтва Рэйтэр перадае, што порт Валона з прычыны вялікіх разбурэнняў цяпер не прыгодзен для скарыстання. Італьянцы скарыстоўваюць невялікі порт Крыонеры, які знаходзіцца па суседству з Валонай.

Афінскі карэспандэнт югаслаўскай газеты «Врэме» паведамляе, што італьянская авіяцыя бамбардыравала грэчаскія пазіцыі ў раёне Тэпелене і дарогу Аргіракастрон — Тэпелене. Англа-грэчаская авіяцыя падвергла бамбардыроўцы камунікацыі італьянскіх войск, дарогі Валона—Тэпелене і Берат—Клісура.

На англа-германскім фронце адзначаецца значная актыўнасць дзеянняў авіяцыі. Германскія бамбардыроўшчыкі, як указваецца ў зводны германскага камандавання, бамбардыравалі палявыя ўмацаванні, што на паўднёвы захад ад Гарвіча, і скапленні суднаў у вусці Тэмзы. Тры германскія самалёты прапалі без вестак. У час налёту англійскай авіяцыі на акупіраваную тэрыторыю ўзбярэжжа Ла-Манша германскімі знішчальнікамі і зенітнай артылерыяй было збіта 17 англійскіх самалётаў.

Англійскае міністэрства інфармацыі, паведамляючы аб вялікай актыўнасці англійскай авіяцыі над Ла-Маншам і Паўночна-Заходняй Францыяй, адзначае, што па працягу 5 лютага было знішчана 6 германскіх самалётаў. Міністэрства ўказвае, што налёт на Дзюсельдорф, які меў месца ў ноч на 5 лютага, прадаўжаўся 4 з палавінай гадзіны. Англійскія самалёты падверглі бамбардыроўцы абшырны раён гэтага прамысловага горада.

Ваенныя дзеянні ў Албаніі

БЕЛГРАД, 6 лютага. (ТАСС). Газета «Врэме» паведамляе, што 5 лютага італьянскія войскі пачалі эвакуацыю Тэпелене. У горадзе ўзніклі вялікія пажары.

На фронце паблізу Валоны грэчаскія войскі занялі вышыні, на якіх знаходзіліся італьянскія ўмацаванні.

Рыхтуюць дастойную сустрэчу XXIII гадавіне Чырвонай Арміі

ГЛЫБОКАЕ. (Кар. «Звязды»). Падрыхтоўка да XXIII гадавіны Чырвонай Арміі ў раёне праводзіцца пад знакам умацавання існуючых абаронных арганізацый і больш шырокага разгортвання масава-абаронпай работы сярод насельніцтва. У раёне налічваецца 43 пярвічныя асноавіяхімаўскія арганізацыі, якія аднаюць 1.448 чалавек. Падрыхтаван без адрыву ад вытворчасці 31 інструктар ПВХА. Раз у тыдзень асоавіяхімаўцы пярвічных арганізацый райаддзела сувязі, Горхарчгандля, гарадской больніцы, калгаса імені Калініна, Літоўшчынскага сельсавета і інш. займаюцца ў гуртках па здачы норм ПВХА.

У раёне створана 9 каманд па падрыхтоўцы да здачы норм на варашылаўскага стралка I ступені. Вучобай па новых комплексных праграмах ахвачана 460 чалавек.

За апошні час у Доме абароны праведзена 8 абаронных вечароў. Былі прачытаны даклады на тэмы: «Ленін і Сталін — арганізатары Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі», «Гераізм і патрыятызм Чырвонай Арміі», «Сучасная вайна», «Супрацьпаветраная і хімічная абарона» і інш. Па раёну налічваецца 21 пярвічная арганізацыя Чырвонага крыжа з 760 членамі. 210 членаў таварыства за апошні час здалі нормы ГСА I ступені і 15 чалавек — II ступені. На курсах медыцынскіх сясцёр займаюцца 32 жанчыны.

Пры раённым Доме абароны наладжана ваенная вучоба комуністаў. Вучобай ахвачана 66 чалавек. Пры партыйным кабінеце абсталёўваецца ваенны кабінет.

Дакументы мінулага

Старынны будынак. Ён нібы спецыяльна прызначан для хавання дакументаў мінулага. На вялікіх паліцах—сотні тысяч аб'ёмістых спраў. Да іх ужо больш нічога не прышываюць, іх рэдка «турбуюць». Тут — справы старых судовых установаў, губернскага прысутствія, казённых палат, гарадской управы, канцылярыі губернатара, дваранскага сабрання земскіх установаў, духоўнага ведамства і інш. Ёсць дакументы, якім ужо 150—200 год.

Гэта Мінскі дзяржаўны абласны архіў. Сюды заглядваюць совецкія вучоныя, гісторыкі. Яны ўважліва вывучаюць дакументы. Нядаўна архіў перадаў рад дакументаў Мінскаму цэнтральнаму гістарычнаму музею: дакладную запіску мінскаму губернатару аб становішчы справы народнай асветы ў Мінскай губерні; запіску старшага фабрычнага інспектара Мінскай губерні аб забастоўках і хваляваннях рабочых і іншыя.

Батальённы камісар — выкладчык палітэканоміі Ленінградскага філіяла Ваенна-Палітычнай Акадэміі таў. Жэўняк рыхтуе работу па гісторыі фінансаў Беларусі. Яму патрэбны пратаколы пасяджэнняў Мінскай Гарадской Думы за пэўны час. Архіў прадаставіў гэтыя дакументы да яго паслуг. Аспірантка Залманава павінна напісаць дысертацыю на тэму «Зубатаўшчына ў Беларусі». Яна карыстаецца матэрыяламі архіва.

Работнікі архіва старанна ахоўваюць дакументы мінулага.

СПАРТЫЎНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ

ВІЦЕБСК. (Па тэлефону). Многа цікавых спартыўных спаборніцтваў праведзена за апошні час у Віцебску. Закончылася першынства горада па канках. У бегу на 100 метраў лепшыя рэзультаты паказалі спартакаўцы Сігірноў і Саламонік, якія прайшлі гэтую дыстанцыю за 12,5 сек. На 1.000 метраў лепшы час — 2 мін. 24,5 сек. — паказаў прадстаўнік спартыўнага таварыства «Праца» тав. Гінтаўт. За 1 мін. 20,6 сек. прайшла 500 метраў тав. Балданава.

Па суме трох дыстанцый 1-е месца заняў абсалютны чэмпіён горада па канках тав. Беленькі («Радзіма»). Сярод жанчын званне абсалютнага чэмпіёна прысуджана Шолахавай («Дынамо»).

На пранягу двух дзён праводзілася гарадская ваенізіраваныя спаборніцтвы паляўнічых. У праграме быў лыжны крос на 10 кілометраў, мятанне гранат у акоп, стэндавая стральба. Першае месца занялі ў гэтых спаборніцтвах паляўнічыя спартыўнага таварыства «Спартак».

Палыходзіць к канцу розыгрыш кубка вобласці па хакею. У поўфінальнай гры перамогі дабіліся хакейныя каманды «Дынамо» і Н-скай часці. 9 лютага адбудзецца фінальная сустрэча паміж гэтымі камандамі, на якой выявіцца пераможца абласнога кубка.

ВЫШЫВАЛЬШЧЫЦЫ

МАЗЫР. (Кар. «Звязды»). Тры гады таму назад у Хойніцкім раёне была арганізавана арцель вышывальшчыц. Цяпер у ёй налічваецца 158 чалавек.

Арцель сваімі вырабамі славіцца далёка за межамі рэспублікі. У 1939 годзе за перавыкананне вытворчай праграмы і высокую якасць прадукцыі арцель была ўзнагароджана граматай Беларускага каапаратыўна-прамысловага совета. У мінулым годзе арцель выканала вытворчую праграму на 106 проц. і атрымала прыбытку 43.000 рублёў. За 25 дзён студзеня гэтага года яна выпусціла прадукцыі на 12.000 рублёў. (у нязменных цэнах 1926—27 гг.). Зараз арцель арганізавала выраб з адыходаў вытворчасці насавых хустачак, салфетак, камбініраванай бялізны і інш.

КОРАТКА

⊙ У Магілеве адбыўся агляд тэатральнай мастацкай самадзейнасці. З вялікім поспехам на ім выступілі драмгурткі аўтарамонтнага завода і шоўкавай фабрыкі. Яны паказалі спектаклі «Дзеці Ванюшына» і «Старыя знаёмыя». Абодва спектаклі атрымалі добрую ацэнку. Калектывы дапушчаны да ўдзелу ў другім туры агляду.

⊙ Шашачны чэмпіянат пачаўся ў г. Віцебску. У ім прымаюць удзел аднаццаць шашыстаў горада. Сярод іх—чэмпіён БССР па шашках тав. Грушэцкі, некалькі першакатэгорнікаў і таленавітыя шашысты — школьнікі Оліфзон, Гурэвіч і інш.

⊙ Закончыў свае гастролі ў Мазыры Пінскі абласны драматычны тэатр. 12 тысяч працоўных горада і раёна глядзелі спектаклі «На бойкім месцы» Остроўскага, «Жыццё кліча» Біль-Белацэркоўскага і інш. Асаблівым поспехам карысталіся пастаноўкі п'ес беларускага драматурга ордэнаноснца К. Крапівы «Партызаны» і «Хто смяецца апошнім».

⊙ Народны камісарыят аховы здароўя БССР для паляпшэння медыцынскай дапамогі насельніцтву арганізаваў гадавыя курсы па падрыхтоўцы хірургаў. Раённымі аддзеламі аховы здароўя вылучаны на гэтыя курсы 43 урачы. Усе яны пасля праходжання вучобы вернуцца на месцы і будуць працаваць у якасці хірургаў.



У лабараторыях навуковага гарадка, які знаходзіцца ў сяле Паўлава (Ленінградская вобласць) вядзецца вялікая работа па прадаўжэнню вучэння вялікага рускага фізіёлага І. П. Паўлава аб вышэйшай нервовай дзейнасці.

На здымку: загадчык лабараторыі, навуковы работнік Э. Вацура праводзіць доследы з малпай-шымпанзе «Рафаэлем».

Фото Санько. (Фото ТАСС).

Кінофестываль у клубах Беларускай чыгункі

ГОМЕЛЬ. (Па тэлефону). Ва ўсіх клубах Беларускай чыгункі праходзіць кінофестываль мастацкіх, навукова-тэхнічных і дзіцячых кінофільмаў. Кінофестываль праводзіцца ў азнаменаванне XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі.

У гомельскім клубе імені Леніна з вялікім поспехам прайшла дэманстрацыя фільмаў «Выбаргская старана», «Якаў Свердлоў», «Вялікае зарава», «Ленін у 1918 годзе». Да пачатку сеанса даецца кароткае аб'яснення зместу фільма.

Новы станок для вырабу цвікоў

ПАРЫЧЫ. (Па тэлефону). Шацілаўская кузнечная арцель Парыцкага раёна да гэтага часу вырабляла цвікі ручным спосабам. У цэху працавала 14 чалавек, за змену яны давалі 300 кг цвікоў.

Нядаўна механік арцелі Аляксандр Арлоўскі скапструіраваў механічны станок для вырабу цвікоў розных размераў. Станок абслугоўваюць усяго два чалавекі. За 8-гадзінны рабочы дзень яны выпускаюць 500 кг высакаякасных цвікоў.

Станок дае эканомію ў 28.800 рублёў у год.

А. КУЗЬМЯНОК.

Суд

ЗРЫЎШЧЫК ЛЕСАЗАГАТОВАК ПАКАРАН

Днямі нарсуд Юраціцкаўскага раёна Баранавіцкай вобласці разглядаў справу грамадзяніна вёскі Пелькаўшчына Чэпавіцкага сельсавета Міцкевіча С. В., які сабатраваў дзяржаўныя лесазагатоўкі. Маючы ўсе магчымасці для выканання задання, Міцкевіч не толькі сам не выканаў сваіх абавязацельстваў, а нават падбухтураваў асобных сялян, каб яны не выязджалі ў лес.

Суд прыгаварыў Міцкевіча С. В. да трох год пазбаўлення волі.

М. ТОЎСТЫ.

Паведамленні

7 лютага, у 8 гадзін 30 мінут вечара у Доме партыйнай асветы (малая зала) адбудзецца лекцыя на тэму «Барацьба Леніна з махізмам».

Чытае тав. Рубенчык. Уваход па абанементах філасофіі і разавых білетах.

7 лютага, у 8 гадзін вечара, у памяшканні Дома партасветы (вялікая зала) Мінскага гарка КП(б)Б склікае нараду сакратароў пярвічных партарганізацый і старшынь арцелей промкаапераціі і каапінсаюза горада Мінска па пытанню аб ходзе выканання арцелямі ўзятых абавязацельстваў да XVIII Усесаюзнай партканферэнцыі.

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУНОЎ.

Дзяржаўны ордэна Леніна Вялікі тэатр оперы і балета БССР
8 лютага
ПІКАВАЯ ДАМА
9/II—Чыо-Чыо-Сан
Пачатак у 8.30 веч. Бліжэйшая прэм'ера балет
ДОН-КІХОТ

Першы Беларускі дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычны тэатр
7 лютага
ПЛАТОН КРЭЧЭТ
Пачатак у 8 г. 30 м. веч.

Дзяржаўны Яўрэйскі тэатр БССР
7 лютага
СЭРКЕЛЭ.
Пачатак у 8.30 веч.

Кінотэатр «Спартак»
ШЛЯХ КАРАБЛЯ

Кінотэатр «Чырвоная зорка»
СУВОРАЎ
Пачатак у 5.15, 7.15, 9.15 і 11 г. веч.

Кінотэатр «Родина»
ГІБЕЛЬ «АРЛА»

Кінотэатр «Інтэрнацыянал»
МУЗЫКАЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

Дзіцячы кінотэатр
ГІБЕЛЬ «АРЛА»

Кінотэатр «Навіны дня»
1. Саюзкінажурналы №№ 5 і 6.
2. Кіножурнал «Паука и техника» № 4.
3. «Курица на улице» (мультыплікация).

МІНСКАЕ БЕЛПЕДВУЧЫЛІШЧА
на аснове распараджэння Нарко масветы БССР
АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР СЛУХАЧОЎ
НА 6-МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ НАСТАЎНІКАЎ 1—4 КЛАСАЎ.
На курсы прымаюцца асобы не маладзей 18 год, скончыўшыя 9 класаў СШ.
КУРСАНТЫ ЗАБЯСПЕЧВАЮЦЦА СТЫПЕНДЫЯЙ І КВАТЭРАЙ.
ПАЧАТАК РАБОТЫ КУРСАЎ 10 ЛЮТАГА 1941 ГОДА.
Заявы аб прыёме на курсы падаваць на імя дырэктара Мінскага педвучылішча — Совецкая 95.
Да заявы прыкласці аўтабіяграфію і дакумент аб адукацыі.
ДЫРЭКЦЫЯ.

БЕЛСКУРАБУТТРЭСТ
АРГАНІЗАВАЎ НА СВАІХ СКУРАНЫХ ЗАВОДАХ
ПУНКТЫ ПА ПРЫЁМЦЫ
У ПЕРАПРАЦОЎКУ СКУРАНОЙ СЫРАВІНЫ НА ДАВАЛЬЧАСКІХ ПАЧАТКАХ
ад здатчыкаў скурсыравіны, выканаўшых свае абавязацельствы перад дзяржавай, згодна пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 20/IV 1940 г.
АДРАСЫ СКУРЗАВОДАЎ:
1. СКУРЗАВОД «БОЛЬШЭНІК» — г. Мінск, вул. Варашылава, 23 тэл. 2-00-64;
ПРЫМАЕ Ў ПЕРАПРАЦОЎКУ: АЎЧЫНУ, КАЗЛІНУ, АПОЕК, ВЫРАСТАК, СВІНЫЯ І КОНСКІЯ СКУРЫ для вырабу верхняга хромавага тавару.
2. СКУРЗАВОД «ЧЫРВОНЫ КАЖЭЎНІК» — г. Барысаў, Загарадная вул. д. № 3, тэл. 2-31;
ПРЫМАЕ Ў ПЕРАПРАЦОЎКУ: АЎЧЫНУ, КАЗЛІНУ АПОЕК — для вырабу верхняга хромавага тавару.
3. СКУРЗАВОД ІМЕНІ СТАЛІНА — г. Магілеў, Быхаўскае шасе, тэл. 88-74;
ПРЫМАЕ Ў ПЕРАПРАЦОЎКУ СКУРЫ буйнай рагатай жывёлы, конскія і свіныя — для вырабу жорсткіх скурташаваў, юхты і сыраматі.
4. СКУРЗАВОД ІМЕНІ ЕЎСЦІГНЕЕВА — г. Віцебск, 1-я Ударная, тэл. 5-81;
ПРЫМАЕ Ў ПЕРАПРАЦОЎКУ СЫРАВІНУ буйнай рагатай жывёлы і свіней — для вырабу жорсткіх скурташаваў.
5. АЎЧЫНА-ФУТРАВЫ ЗАВОД «ПРОЛЕТАРСКІ ШЛЯХ» — г. Гомель, Совецкая, 105, тэл. 2-65;
ПРЫМАЕ Ў ПЕРАПРАЦОЎКУ ФУТРАВУЮ АЎЧЫНУ.
БЕЛСКУРАБУТТРЭСТ.

ТАВАРЫШЫ КАЛГАСНІКІ! АРГАНІЗУЙЦЕ
НАДЗЕЙНУЮ ПАЖАРНУЮ І СТАРАЖАВУЮ АХОВУ КАЛГАСНАЙ МАЕМАСЦІ.
Сачыце ЗА СПРАЎНАСЦЮ ПЯЧЭЙ І ДЫМАХОДАЎ.
НЕ ПАКІДАЙЦЕ ДЗЯЦЕЙ АДНЫХ ДОМА.
Не дапускайце КУРЭННЯ І РАБОТ З АДКРЫТЫМ АГНЁМ У МЕСЦАХ, ДЗЕ ЁСЦЬ ГАРУЧЫ МАТЭРЫЯЛ.
Памятайце, ШТО ПАЖАР ЛЯГЧЭЙ ПАПЯРЭДЗІЦЬ, ЧЫМ ТУШЫЦЬ.
А.П.А. УНКВД па Мінскай вобласці.

КУПЛЯЙЦЕ Ў МАГАЗІНАХ Мінгорпрамгандля
ПОЛЬТЫ ЖАНОЧЫЯ І МУЖЧЫНСКІЯ
ПОЛЬТЫ ШКОЛЬНЫЯ І ДАШКОЛЬНЫЯ ДЛЯ ХЛОПЧЫКАЎ І ДЗЯЎЧЫНАК,
КАСЦЮМЫ мужчынскія суконныя,
БРУКІ І ГІМНАСЦЁРКІ суконныя.
У ВЯЛІКІМ ВЫБАРЫ РОЗНЫЯ галантарэйныя ТАВАРЫ.
ЧУЛКІ жаночыя і дзіцячыя, НАСКІ мужчынскія
КУПОНЫ дамскія, мужчынскія і дзіцячыя
РУЧНОЙ ВЫШЫЎКІ.
Мінгорпрамгандаль.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Мінск, Совецкая, 49. Тэлефоны рэдакцыі: адказны рэдактар—20-000 (камутатар), дадатковы—102, прыёмная рэдактара — 2-13-52, намеснік адказнага рэдактара — 2-51-88, адказнага сакратара — 2-13-53, намеснік адказнага сакратара — 2-24-12, сакратарыята — 2-39-55. Аддзелы: загадчык партыйнага аддзела — 2-18-46, літработнікаў — 2-13-56, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі — 2-51-89, загадчык эканамічнага аддзела — 2-08-30, літработнікаў — 2-15-56, літработнікаў па літаратуры і мастацтву, школах, ваенна-фізкультурнай рабоце, унутранай інфармацыі — 2-18-85, аддзела рабселькораў і пісем працоўных — 2-13-60, заг. выдавецтва — 2-13-58, бухгалтэрыі выдавецтва і аддзела аб'яў — 2-08-44, выпускаючага — 2-47-68, карэктарскай — 2-13-57

У1139. Друкарня газеты «Звязда». М., М., Ш.